Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
10 ВЕРАСНЯ 2022 г. СУБОТА № 178 (29800)



КВЕТКАГОЛІК З РАГАЧОВА 12

КІТАЙ АДЗНАЧАЕ СВЯТА СЯРЭДЗІНЫ ВОСЕНІ 13



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Наша задача — забяспечыць максімальнае насычэнне ўнутранага рынку беларускай прадукцыяй, павялічыць прысутнасць айчынных тавараў на прылаўках магазінаў. За апошняе дзесяцігоддзе працэнт прадстаўленасці і продажу ў рознічным гандлі нашых тавараў зніжаўся. Але за першае паўгоддзе гэтага года нам удалося пераламаць тэндэнцыю. Мы павялічылі аб'ёмы продажаў па 22 харчовых і 11 нехарчовых пазіцыях тавараў. Гэтую тэндэнцыю мы будзем прадаўжаць і далей. У дактрыне нацыянальнай харчовай бяспекі запісана, што на паліцах павінна быць 80—85 працэнтаў айчыннай прадукцыі. «Калі браць харчовы сектар, то тут мы блізка знаходзімся да гэтага паказчыка. Цяпер ён складае 77 працэнтаў, у нехарчовым сектары тавараў — 41,3 працэнта. У гэтай частцы нам трэба будзе сур'ёзна дапрацоўваць».*

Святочнае

# З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, СТАЛІЦА!




**Сталіца святкуе свой 955-ы дзень нараджэння. Традыцыйна Дзень горада праходзіць у другія выхадныя восені— 10 і 11 верасня. Аб тым, што цікавага мы ўбачым, пра само свята і пра месцы, якія абавязкова варта наведаць, расказваем у нашым матэрыяле.**

СТАР. 4

Мінчанкі, студэнткі трэцяга курса Мінскага гандлёвага каледжа Валерыя КУРСЕВІЧ і Юлія ЗАЙЦАВА гуляюць па прыгожых і ўтульных вуліцах і плошчах роднага горада, каб пабыць разам з іншымі гараджанамі — жыхарамі і гасцямі ды павітаць сталіцу з 955-м днём нараджэння.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- **Пуцін даручыў МЗС РФ падтрымаць прасоўванне паставак на сусветныя рынкі беларускіх угнаенняў.**
- Інфляцыя ў Беларусі ў жніўні склала 0,1 працэнта.
- На Мінск прыпадае трэць ВУП Беларусі і больш за палову аптовага тавараабароту.
- **Казахстан і Узбекістан зацікаўленыя ў пашырэнні сумеснай кінавытворчасці з Беларуссю.**

У сезон

# ЧАС ДРУГОГА ХЛЕБА

## Чым парадуюць селекцыянеры?

**У Беларусі бульбу называюць другім хлебам, а беларусаў завуць бульбашамі — словам, каму разбірацца ў бульбе, як не нам? На старце сезона ўборкі бульбы адправіляемся ў Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве, каб даведацца аб новых сартах другога хлеба. А таксама пра тое, як правільна збіраць наш нацыянальны караняплод і захоўваць яго зімой.**

СТАР. 5



ISSN 1990 — 763X
22178

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!
Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «ДУМАЙЦЕ ЯК ГАСПАДАРЫ СВАЁЙ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду з кіраўніцтвам Савета Міністраў. Абмяркоўваўся шырокі спектр пытанняў, якія датычацца развіцця розных сфер эканомікі. Гэта і ўдасканаленне прадпрымальніцкай дзейнасці, і развіццё аграэкатурызму, і стварэнне інстытута па фінансавым кансультаванні насельніцтва, і абыходжанне з радыеактыўнымі адходамі.**

Пачынаючы нараду, кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым, што мерапрыемства гэта традыцыйнае. «Калі трэба парайцца па пэўных пытаннях са спецыялістамі, распрацоўшчыкамі тых ці іншых нарматыўна-прававых актаў, мы праводзім такую нараду — для таго, каб не дапусціць памылак пры фарміраванні нарматыўна-прававой базы Беларусі і канкрэтных актаў», — удакладніў беларускі лідар.

## Празрыстасць у прадпрымальніцкай дзейнасці

Першае пытанне, вынесенае на абмеркаванне, датычылася ўдасканалення заканадаўства ў прадпрымальніцкай дзейнасці. Урад прапануе мадэрнізаваць фармат функцыянавання гэтага сегмента эканомікі, абапіраючыся на два фундаментальныя прынцыпы: прастата і справядлівасць. Па перакананні Прэзідэнта, так павінна быць у любым нарматыўна-прававым акце.

«Мая галоўная ўмова — гэта празрыстасць і магчымасць кантролю прадпрымальніцкай дзейнасці, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Бізнес павінен мець зразумелыя правілы для старту і росту, а дзяржава — добрасумленнага плацельшчыка падаткаў і партнёра ў рэалізацыі праграм развіцця. Тое, што ў нас тут конь не валяўся, што называецца, гэта няўзброеным вокам бачна. Адны жыруюць. Пры гэтым у тых сферах, якія ўвогуле павінны належаць дзяржаве».

Звярнуў беларускі лідар увагу і на праблему гібелі лесу, якую не так даўно ўздымаў падчас сваёй рабочай паездкі ў Гродзенскую вобласць. Калі падысці да яе па-гаспадарску, то можна і цэны на вырабы з драўніны зрабіць больш-менш разумнымі, і вырашыць пытанне з маладымі спецыялістамі. І не будзем потым скардзіцца, што апошнія не хочуць заставацца ў сельскай гаспадарцы. «Як вы іх замацуеце? — разважае кіраўнік дзяржавы і адразу прапаноўвае канкрэтнае рашэнне: — Вазьміце лес, які мы несвоечасова высякаем (ён жа заўтра прападзе, не будзе вечна стаяць). Драўніна павінна ўбірацца, бо збожжавала на палях. Зразаем, пускаем у справу, высаджваем новыя дрэвы. Гэта ж зразумела ўсім. Не, тут будзе гніць, гніць гэтая драўніна, а каб людзям даць... Давайце пачнем з таго, што спецыялістам у вёсцы, якія небагатыя, пабудуем добрыя хаты. У нас жа ёсць ліній цэлыя: на працягу сутак дом гатовы. Прыедуць і паставяць на фундамент, далей няхай там дарабляюць разам з калгасамі, саўгасамі».

Такім чынам, пастаўлена задача — вычленіць шматдзетных і тых, хто мае неабходнасць ва ўласным жыллі ў сельскай мясцовасці, і зрабіць так, каб яны бясплатна або за паўцаны (каб не перапрадавалі потым, што, дарэчы, вельмі проста можна пракантраляваць), атрымалі драўніну. Гэта прыклад таго, калі ідэю, якая падаецца Прэзідэнтам, неабходна хутка рэалізоўваць.

Што датычыцца празрыстасці і кантролю прадпрымальніцкай дзейнасці, то, па словах Аляксандра Лукашэнкі, ніхто ні на кога не ціsне. «Правяралі выплату падаткаў і будзем правяраць, — канстатаваў Прэзідэнт. — Эвалюцыйным шляхам неабходна стварыць прадпрымальніцкае асяроддзе, якое будзе адпавядаць запытам нашага грамадства».

Асаблівую ўвагу кіраўнік дзяржавы звярнуў на работу індывідуальных прадпрымальнікаў. «Трэба стварыць прадпрымальнікам стымул да трансфармацыі ў юрыдычную асобу — гэта факт, — адзначыў ён. — Аднак з індывідуальнымі прадпрымальнікамі трэба разбірацца не таму, што яны ў 2020 годзе выйшлі супраць тых, хто іх спарадзіў і падтрымаў. Індывідуальны прадпрымальнік па сутнасці павінен быць індывідуальным. Гэта фактычна — рамеснік, чалавек, які робіць тое, што ніхто, акрамя яго, зрабіць не зможа. А ў нас што адбылося? У нас усе сталі прадпрымальнікамі: ад ваенна-прамысловага комплексу да вясельных і пахавальных рытуалаў».

У гэтым плане пазіцыя Прэзідэнта адназначная — трэба ўсіх паставіць на месца. «Хочаш быць індывідуальным прадпрымальнікам (а ён павінен быць гэты індывідуальны прадпрымальнік), ідзі пляці кошыкі, з саломы капелюшы рабі і іншае — такія рэчы, якія могуць зрабіць унікальныя людзі: мастакі, скульптары і гэтак далей. Не шкада такому чалавеку і льготу даць». У сувязі з гэтым Прэзідэнт патрабуе стварэння дакладна выбудаванай сістэмы — прававых форм арганізацыі бізнесу і яго справядлівага падаткаабкладання.

## Пад выглядам аграсядзіб — гасцінічны і рэстаранны бізнесы

Абмяркоўвалася падчас нарады і развіццё аграэкатурызму. Калісьці Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся і даў старт гэтаму працэсу. «Каб людзі, якія жывуць у вёсцы, у куточках цудоўнай прыроды нашай Беларусі, змаглі паказаць гэты дар Божы людзям, тым больш, што іншаземцы прыязджаюць, — растлумачыў беларускі лідар. — Каб ім (гаспадарам аграэкасядзіб. — **«Зв.»**) прадаставіць ільготы, каб яны маглі зарабіць, каб даць штуршок развіццю гэтым хутарам, «мядзведжым» куточкам. Сфера значная ў плане мадэрнізацыі і развіцця сучаснай інфраструктуры ў вёсцы, стварэння працоўных месцаў, захавання і памнажэння нашых нацыянальных і культурных традыцый, выхавання беражлівых адносін да прыроды».

Прэзідэнт бываў у такіх аграэкасядзібах, дзе што толькі яму не паказвалі. Аднак паказаць, па яго словах, мы ўмеем, толькі ў што ўсё гэтаператварылася? Кіраўніку дзяржавы дакладваюць, што асобныя нормы Указа, які сёння рэгулюе сферу аграэкатурызму (ад 9 кастрычніка 2017 г. № 365), выконваюцца фармальна. У якасці прыкладаў прыводзяцца канкрэтныя факты. Не зжыты выпадкі, калі пад выглядам аграсядзіб на сістэмнай аснове квітнеюць гасцінічны і рэстаранны бізнесы, асабліва паблізу вялікіх гарадоў. І калі гасцінічны бізнес у горадзе бачны, ён празрысты (людзі плацяць адпаведныя падаткі), то за межамі горада пад выглядам аграэкатурызму пабудавалі гасцініцы і рэстараны. Ніхто не супраць, але і падаткі патрэбна плаціць адпаведныя гасцінічнаму і рэстараннаму бізнесу.

У гэтым ключы Прэзідэнт папрасіў далажыць, што плануецца зрабіць для ўпарадкавання дзейнасці нядобрасумленных уладальнікаў аграэкасядзіб, якія пераўтварыліся выключна ў гасцінічныя комплексы. Таксама кіраўнік дзяржавы хоча ведаць, як новаўвядзенні адаб'юцца на сядзібах, размешчаных у далечыні ад вялікіх гарадоў, якія, перажыўшы няпростыя каранавірусныя часы, працуюць сумленна і працягваюць карпатліва развіваць свой патэнцыял. «Адна справа, каля буйных гарадоў, на бойкіх месцах, пад выглядам аграэкасядзіб арганізавалі гасцініцы і рэстараны, іншая справа — аграэкасядзібы, якія створаны ў «мядзведжых» куточках», — падкрэсліў беларускі лідар. Пры гэтым вельмі важна, як прапанаваныя змены будуць стымуляваць развіццё рэгіянальнай ініцыятывы і канкрэтных тэрыторый.

## «Кансультацыі павінны быць бясплатнымі»

Трэцім пунктам на парадку дня стаў праект Указа аб стварэнні паўнацэннага інстытута па фінансавым кансультаванні насельніцтва. «Як мне паведамляюць, наспела неабходнасць грунтоўна заняцца рознага роду кансультантамі», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што цалкам беспакарана нядобрасумленныя брокеры (у народзе іх ужо празвалі «чорнымі» і «шэрымі») нажываюцца і на пажылых людзях, і нават на цалкам прагрэсіўнай моладзі. Ён растлумачыў, што Нацыянальны банк матывуе стварэнне адпаведнага інстытута кансультантаў.

«Я не супраць. Правільна! Але нам жа што прапануецца (я наўскідку, нічога не адмаўляючы): стварыць нейкія канторы, дзе банкіры будуць кансультаваць нашых людзей: у якія банкі пайсці, якія крэдыты ўзяць і гэтак далей. Хто пойдзе ў гэтыя канторы кансультавацца? Моладзь? Не. Адукаваныя людзі? Не. Журналісты — не. Яны патыкаюць у тэлефон, там усё выкладзена: і банкі пералічаны, і крэдыты таксама. Хто туды пойдзе? Бедныя людзі, сяляне, пенсіянеры — яны туды пойдуць. Іх будуць кансультаваць, калі мы створым канторы», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён запытаў, бясплатна ці за грошы будуць праводзіцца фінансавыя кансультацыі. Прапаноўваецца аказваць такія паслугі за грошы.

«Дзе ж справядлівасць у нашым грамадстве? Мы ж дзяржаву для народа будуем! Мы ж у савецкія часы і да гэтай пары па некаторых пытаннях рабілі гэта бясплатна. Банкі ж зацікаўленыя, каб выдаць крэдыт. Не, я падазраю, трэба банкірам даць яшчэ адзін шлях абдзіралаўкі народа. У нас банкіры «бедныя», — абурыўся кіраўнік дзяржавы і прызнаўся, што менавіта гэта яго насцярожыла і таму адклаў дакумент і вынес яго на абмеркаванне. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ён за кансультацыі. Але навошта з людзей браць грошы за гэта? «Не бедныя ж людзі, якія будуць кансультаваць. Каму мы хочам даць работу і зарабляць на нашых людзях?» — спытаў ён.

Кіраўнік дзяржавы прывёў прыклад. Пенсіянеры з Брэста планавалі ўзяць крэдыт і пабудаваць дачны дом. Звярнуліся да пасярэдніка, які іх пераканаў, што без кансультанта «банк грошай не дасць».

---

**У тэму**

## Прадпрымальніцтва — па новых правілах

Законапраект аб развіцці прадпрымальніцтва, прадстаўлены падчас нарады з Саўмінам, па рашэнні Прэзідэнта Беларусі быў адпраўлены на дапрацоўку. Па меркаванні Аляксандра Лукашэнкі, заканадаўства ў сферы прадпрымальніцкай дзейнасці, павінна быць максімальна зразумелым кожнаму грамадзяніну.

«Менавіта на складанасць сістэмы і звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, — падзяліўся з журналістамі падрабязнасцямі абмеркавання гэтага пытання **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ.** — Было падкрэслена, што сістэма дастаткова груваздкая, шматзначная, і чалавеку, які захацеў бы разабрацца, з чаго яму пачынаць, сапраўды складана. Таму была дадзена даручэнне спрасціць сістэму, каб яна была дастаткова зразумелай, празрыстай і справядлівай».

Чалавек, які хоча займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, павінен разумець, што ёсць рамеснікі, індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы. Сёння сістэма дастаткова шматаблічная, і грамадзяніну, які хоча займацца прадпрымальніцтвам, цяжка разабрацца, у якасці каго ён будзе гэта рабіць. Прэзідэнт запатрабаваў больш дакладна вызначыць у законапраекце віды дзейнасці, якімі могуць займацца рамеснікі, індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пытанне не ў тым, як называць тую ці іншую форму прадпрымальніцкай дзейнасці, і не ў тым, што трэба адыходзіць ад такой формы, як ІП. Адыходзіць ад індывідуальнага прадпрымальніцтва не плануюць, проста неабходна дакладна вызначыць канкрэтныя віды дзейнасці для ўсіх формаў вядзення малога бізнесу.

«Кожны чалавек — гэта патэнцыял нашай краіны, патэнцыял, які прыблізна аднолькава павінен уносіць уклад у фінансаванне дзяржаўнага бюджэту, дзяржаўных сацыяльных расходаў, — падкрэсліў Аляксандр Чарвякоў. — Гэты момант мы таксама павінны ўлічыць пры дапрацоўцы закона аб развіцці прадпрымальніцтва».

## Указ надасць стымул развіццю аграэкатурызму

**Міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК** расказаў журналістам, што праект указа аб развіцці аграэкатурызму знаходзіцца ў найвышэйшай ступені гатоўнасці. Па словах міністра, гэты від турызму ў краіне развіваецца вельмі дынамічна. За апошнія 15 гадоў Беларусь стала адным з еўрапейскіх лідараў па развіцці аграэкатурызму.

Сяргей Кавальчук растлумачыў, якія асноўныя навацыі прапаноўвае праект Указа. Дакументам прадугледжана адказнасць гаспадароў сядзіб за грамадскі парадак на сваёй тэрыторыі, раней за гэта адказвалі толькі госці. «Больш паўнамоцтваў дадзена мясцовым органам улады, яны будуць вызначаць раёны і рэгіёны, дзе трэба стымуляваць развіццё гэтага віду турызму. На жаль, у нас адбыўся ўхіл у Мінску, Брэсце, Віцебску — у абласных цэнтрах, буйных гарадах, побач з імі гэты від турызму актыўна развіваецца. Але ў аддаленых раёнах, там, дзе неабходна, наадварот, сёння гэты від турызму развіваецца горш. Таму ў гэтых раёнах павінны быць адпаведныя прэферэнцыі і льготы. І сістэма падаткаабкладання павінна туды ісці з прэферэнцыйнымі мерапрыемствамі і комплексамі. У гэтым Указе ўсё ўлічана, і я спадзяюся, што ён надасць яшчэ большы імпульс развіццю аграэкатурызму ў нашай краіне», — адзначыў міністр.

Таксама ў кожным рэгіёне створаны камісіі, якія будуць вызначаць, што з сябе ўяўляе той ці іншы турыстычны аб'ект: гасцініца, рэстаран, аграэкасядзіба. І ўжо ў адпаведнасці з рашэннем камісіі будзе дадзена права займацца тым ці іншым відам дзейнасці.

## Новыя падыходы да работы з радыеадходамі

**Міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ** падкрэсліў, што пытанне захоўвання радыеактыўных адходаў вельмі актуальнае для нашай краіны. «Радыеактыўныя адходы ўтвараюцца ў медыцыне, прамысловасці, навуковай дзейнасці і ў іншых галінах, дзе выкарыстоўваюцца іанізавальныя крыніцы выпраменьвання. Гэтае пытанне таксама звязана і з новым аб'ектам — Беларускай атамнай электрастанцыяй, дзе таксама будуць утварацца радыеактыўныя адходы», — растлумачыў ён. Міністр расказаў, што Прэзідэнт даў даручэнне дадаткова прааналізаваць, як радыеактыўныя адходы цяпер утвараюцца, што размешчана на спецпрадпрыемстве «Экарэс», што будзе ў будучыні, вывучыць магчымыя падыходы і тэхналогіі па абыходжанні з радыеактыўнымі адходамі. І асобна далажыць па гэтым напрамку. Па словах Віктара Каранкевіча, міністэрства энергетыкі будзе праводзіць гэтую работу разам з іншымі органамі ўлады і вучонымі.

# КРАІНЫ»

Але за так званую «дапамогу» трэба заплаціць тысячу рублёў. Прыйшлі ў банк, а там — «калі ласка, бярыце і без усялякіх пасярэднікаў». Дык гэтае жуллё стала вымагаць грошы за «паслугу», якой, па сутнасці, не было. Напалохалі пенсіянераў так, што тыя нават атрыманы крэдыт назад у банк аднеслі, аддалі і нават звязвацца не захацелі. «Каго мы крыўдзім?» — задаў пытанне Прэзідэнт. І нават міліцыя тым людзям дапамагчы не змагла — усё было па дамове.

«Значыць, бяруць з людзей каласальныя грошы за тое, што раздрукавалі інфармацыю з інтэрнэту, якая і без іх даступная кожнаму. Затым падсоўваюць кабальны дагавор за свае псеўдапаслугі. Вось да чаго гэта прывядзе. Кантору пабудуем, і банк пашле да кансультанта, каб зарабіць грошы, а потым, магчыма, гэтыя грошы і падзяліць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што падобны прыклад ужо быў у сістэме аховы здароўя — маецца на ўвазе так званая «справа артапедаў».

«Чалавеку, які хоча пабудаваць нешта на сваім участку, мы — і органы ўлады, і банкіры — найперш мы павінны яму адказ даць, калі ён не зразумеў сістэму. Мы яму павінны сказаць — бясплатна», — канстатаваў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, самае абуральнае, што, набіваючы сваю кішэню, такія арганізацыі не нясуць ніякай адказнасці, не даюць гарантый, што падабраны імі банкаўскі прадукт сапраўды будзе даступны для таго, хто да іх звярнуўся. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што здараюцца сітуацыі, калі чалавек, заплаціўшы немалую суму за такую кансультацыю, ідзе ў банк, упэўнены, што зараз атрымае крэдыт. А яму адмаўляюць, бо там свае працэдуры і патрабаванні. У выніку ён застаецца без грошай, на якія разлічваў, ды яшчэ і са стратай. «Бардак. Таму давайце ствараць канторы. Стварайце, але бясплатна!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт папрасіў далажыць, як прапануецца рэгуляваць гэтую сферу. Ён пацікавіўся, якія гарантыі атрымліваe чалавек, звяртаючыся да фінансавых кансультантаў. «Галоўнае, калі яны ёсць, іх трэба прымусіць працаваць бясплатна. І ўзяць пад жорсткі кантроль. Нацбанк павінен галавой адказваць, каб яны, па-першае, працавалі, па-другое, каб не было гэтай абдзіралаўкі», — канстатаваў ён. Таксама кіраўнік дзяржавы паставіў пытанне, хто будзе кантраляваць дзейнасць такіх арганізацый і ці па ўсім фінансавым спектры людзі будуць атрымліваць кансультацыі. «Самае галоўнае — ці не стануць банкі і іншыя арганізацыі браць грошы за тое, за што цяпер не бяруць», — звярнуў увагу ён.

### «Прадукт вельмі небяспечны, але каштоўны»

Наступнае пытанне, якое абмяркоўвалася падчас нарады, — радыеактыўная адходы. «Мы фактычна з нуля стварылі ў краіне новую галіну з узвядзенням Беларускай АЭС. Не сёння — заўтра нам спатрэбіцца ўтылізаваць ядзерныя адходы. Прадукт вельмі небяспечны, але каштоўны. Таму я ставіў задачу выбудаваць у краіне надзейную сістэму абыходжання з такога роду адходамі, стварыць адпаведную інфраструктуру», — сказаў Прэзідэнт. Ён папрасіў, каб яму растлумачылі, калі гэта каштоўны прадукт, чаму яго трэба некуды бясплатна вывозіць або нейкі час захоўваць, а потым вывозіць. «Вопыт мы вывучылі. Мы яго ведаем.

Давайце зробім, бо выгадна для нас у гэтым складаным становішчы», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар нагадаў, што гэтае пытанне абмяркоўвалі яшчэ ў мінулым годзе. Тады вырашылі, што гэтым зоймецца асобная арганізацыя, так званы нацыянальны аператар.

Як заўважыў Прэзідэнт — усё па заходнім узоры. Мяркуецца, што гэты аператар возьме на сябе клопат па збудаванні аб'ектаў абыходжання з радыеактыўнымі адходамі і будзе паўнавартасна кіравацца працэсам. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, па-першае, гэта адпавядае ўстаноўленым сусветным стандартам. Па-другое, гэта бяспека і здароўе беларускай нацыі і нашых суседзяў.

Праўда, як заўважыў Прэзідэнт, суседзі не вельмі «парацца» наконт здароўя беларусаў.

«Галоўнае маё патрабаванне — ніякай нагрузкі на бюджэт. Ніякіх дадатковых міністэрстваў і ведамстваў пад грыфам аператара. А калі вы хочаце нейкага аператара стварыць, калі ласка — Мінэнерга, за кошт іх і ствараць», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, неабходна вырашыць, што будзем рабіць з гэтымі адходамі. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, ці трэба ўвогуле іх захоўваць, можа, іх варта адразу загрузіць і вывозіць. «Адпрацаваныя адходы — гэта нам ці не? Наша. Дык можа патрымаць у сябе пакуль? Гэта рэсурс. Думайце як гаспадары сваёй краіны», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што беларусы павінны быць упэўнены, што ніякай радыяцыі на нашай тэрыторыі не з'явіцца. Па яго словах — гэта галоўнае.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Валерыя СЦЯЦКО.**

17 верасня — Дзень народнага адзінства

# Свой падыход да гістарычнай памяці

**Мы глядзім на нашу гісторыю аб'ектыўна, з беларускіх пазіцый, з пункту гледжання гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Аб гэтым на дыялогавай пляцоўцы рэспубліканскай інфармацыйна-асветніцкай акцыі «Беларусь адзіная» ў Барысаве сказаў рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, паведамляе БелТА.**

Па словах гісторыка, Дзень народнага адзінства накіраваны на захаванне нашай гістарычнай памяці. Дзяржаўнае свята звязана з сапраўдным працэсам уз'яднання беларускага народа, які пачаўся 17 верасня 1939 года. «Мы павінны памятаць пра гэта. У нас павінен быць свой уласны погляд на наша гістарычнае мінулае. Гэта вельмі важна ва ўмовах, калі сучасны глабалізаваны свет вельмі схільны да скажэння і фальсіфікацыі гістарычнага мінулага. Мы вельмі добра бачым, як гэта адбываецца на Захадзе, які спрабуе навязаць нам свае каштоўнасці, ідэі і погляды, у тым ліку і на наша гістарычнае мінулае. Асабліва актыўна гэты працэс пачаў развівацца пасля развалу Савецкага Саюза», — адзначыў Вячаслаў Даніловіч.

Тым не менш, як падкрэсліў эксперт, у Беларусі ўдалося захаваць свой падыход да гістарычнай памяці: «Дзякуючы пазіцыі кіраўніцтва дзяржавы на чале з Прэзідэнтам Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам нам удалося захаваць свой, беларускі падыход да гістарычнай памяці, які не адхіляе ні адзін гістарычны перыяд, — ад старажытнасці па савецкі перыяд уключна. Мы глядзім на нашу гісторыю аб'ектыўна, з нашых беларускіх пазіцый, з пункту гледжання гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Якраз пра гэта мы сёння гаворым на дыялогавай пляцоўцы, і менавіта таму Дзень народнага адзінства знакавае для нас свята. У сучасным свеце мы, беларусы, можам выдужаць толькі ў тым выпадку, калі будзем адзіныя ў сваёй большасці, калі будзем падтрымліваць і захоўваць тое, што ў нас ужо маецца, удасканальваць, а не разбураць яго».

Дыялогавая пляцоўка «Беларусь адзіная», прымеркаваная да Дня народнага адзінства, сабрала ў Барысаве каля 800 чалавек. Сустрэча працягнула цыкл рэгіянальных форумаў ва ўсіх абласцях краіны.

Фінансы

# Спажывецкія крэдыты будуць таннець

**Нацбанк ужо намякае, што крызіс у фінансах завяршыўся, а камерцыйным банкам пара прыступаць да крэдытавання насельніцтва і прадпрыемстваў у звычайным рэжыме**

**Гэтымі днямі галоўны фінансавы рэгулятар краіны пачаў сваімі дзеяннямі стымуляваць зніжэнне ставак па спажывецкіх крэдытах. Сапраўды, у верасні Нацыянальны банк Беларусі аднавіў вызначэнне разліковых велічынь стандартнай рызыкі (РВСР) пры выдачы крэдытаў банкамі, што будзе ўтрымліваць іх ад устанаўлення занадта высокіх працэнтаў па крэдытах.**

Як адзначаюць аналітыкі партала «Усе банкі Беларусі», вызначэнне паказчыка РВСР Нацбанк прыпыніў у сакавіку бягучага года, што было выклікана жаданнем даць камерцыйным банкам больш магчымасцяў па аператыўных дзеяннях у перыяд нявызначанасці на фінансавым рынку. Але цяпер, падобна, у Нацбанку лічаць, што фінансавы крызіс завяршыўся або аслабеў да такой ступені, што пара змагацца з завышанымі стаўкамі па крэдытах.

Разліковая велічыня стандартнай рызыкі для новых крэдытаў, якія прадстаўляюцца банкамі юрыдычным асобам, устаноўлена з 12 верасня роўнай 20,80 %, а па новых крэдытах фізічным асобам — 23,33 %. Гэта вышэй за аналагічных паказчыкі, устаноўленыя у лютым, якія адпаведна былі роўныя 16,38 % і 20,38 % гадавых. Такім чынам, да дакрызісных узроўняў ставак рынак крэдытавання пакуль не вярнуўся, але ўжо цяпер можна зрабіць выснову, што дзеянні Нацбанка з'яўляюцца прызнаннем таго, што крызіс у фінансах завяршыўся, і камерцыйным банкам пара прыступаць да крэдытавання насельніцтва і прадпрыемстваў у звычайным рэжыме, лічаць аналітыкі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Брытанцы развітваюцца са сваёй каралевай



**Лізавета II займала брытанскі прастол з 1952 года, у чэрвені 2022 года ў краіне шырока адзначаўся «плацінавы юбілей» — 70-годдзе яе праўлення.**

Але ўжо ў пачатку верасні пасля абрання Ліз Трас прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі Лізавета II упершыню за час свайго праўлення не адправілася ў Лондан для сустрэчы з новым кіраўніком кабміна, аўдыенцыя адбылася ў замку рэзідэнцыі каралевы ў Шатландыі.

8 верасня стала вядома аб пагаршэнні стану здароўя каралевы, Букінгемскі палац заявіў, што ўрачы рэкамендавалі ёй заставацца пад медыцынскім наглядам. Вечарам каралевы не стала.

Лізавету II пахаваюць у мемарыяльным комплексе — капліцы яе бацькі караля Георга VI. Мемарыял знаходзіцца на тэрыторыі Віндзорскага замка.

Англічане ўжо выказваюць смутак: людзі нясуць кветкі да палаца. Сайт Букінгемскага палаца, а таксама найбуйнейшыя выданні Вялікабрытаніі афарбаваліся ў жалобныя колеры. У краіне аб'яўлена нацыянальная жалоба, на будынках прыспушчаны дзяржаўныя флагі.



Згодна з раней распрацаваным сцэнарыем, каралеву пахаваюць праз 10 дзён у Віндзорскім замку.

Пасля смерці каралевы Вялікабрытаніі Лізаветы II новым англійскім манархам стаў старэйшы сын кіраўніцы, 73-гадовы прынц Уэльскі Чарльз. Датай афіцыйнага абвяшчэння Карла III каралём Вялікабрытаніі выбралі суботу, 10 верасня. Аб гэтым паведамляе выданне The Times. Паводле інфармацыі СМІ, у пятніцу, 9 верасня, кароль і каралева-кансорт Каміла вернуцца з замка Балмарал у Лондан.

Уступленне новага караля Карла III на брытанскі прастол падштурхне палітыкаў і актывістаў у былых калоніях Карыбскага басейна да новых заклікаў пазбавіць манарха статусу кіраўніка дзяржавы і патрабаваць ад Лондана выплаты рэпарацый за рабства. Пра гэта паведамляе Reuters. Да гэтага часу ў 14 краінах Садружнасці па-ранейшаму прызнаюць брытанскага манарха кіраўніком дзяржавы. Аднак у грамадстве карыбскіх краін існуюць розныя пункты гледжання аб далейшых адносінах з Брытаніяй, што прадэманстраваў і сакавіцкі тур герцагаў Кембрыджскіх на Карыбы. Тады жыхары Беліза пратэставалі супраць манархіі, а на Багамскіх астравах Нацыянальны камітэт рэпарацый звярнуўся да герцагаў з лістом з патрабаваннем аб кампенсацыях за рабства.

**Ад імя беларускага народа і сябе асабіста Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні каралю Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Карлу III, народам Злучанага Каралеўства, а таксама краін Садружнасці, адрасаваў словы падтрымкі членам каралеўскай сям'і ў сувязі са смерцю каралевы Лізаветы II. Аб гэтым паведаміла ў прэс-службе беларускага лідара.**

**«Сямідзесяцігадовая эпоха праўлення Яе Вялікасці стала сімвалам сапраўднага служэння свайму народу, залогам стабільнасці і дабрабыту Злучанага Каралеўства і краін Садружнасці на доўгія гады. Яна звязала пакаленні, якія не раз з гонарам і годнасцю пераадольвалі самыя нялёгкія выпрабаванні. Нават у найбольш цяжкія часы дзяржаўная мудрасць і аўтарытэт Лізаветы II заўсёды давалі магчымасць узняцца над палітычнай кан'юнктурай, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — У Рэспубліцы Беларусь з глыбокай павагай і адказнасцю ставяцца да маральнага запавету Яе Вялікасці аб безальтэрнатыўнасці далейшага руху чалавецтва па шляху добрасуседства і міласэрнасці».**

### КНДР заканадаўча замацавала статус ядзернай дзяржавы

**У КНДР прыняты новы закон, які замацоўвае за дзяржавай права нанесці прэвентыўны ядзерны ўдар па праціўніку ў выпадку, калі Пхеньян палічыць, што пагроза з яго боку непазбежная, паведамляе ТАСС са спасылкай на агенцтва KCNA.**

Размова ідзе аб законе аб палітыцы ў сферы ядзерных сіл. Як падкрэсліў на пасяджэнні Вярхоўнага народнага сходу, які прыняў гэты закон, лідар КНДР Кім Чэн Ын, краіна завяршыла гістарычную справу, поўнасцю юрыдычна замацаваўшы палітыку ядзерных сіл.

У законе, у прыватнасці, гаворыцца, што КНДР, будучы «адказнай ядзернай дзяржавай», не стане перадаваць іншым краінам ядзерную зброю, дзяліцца ядзернымі тэхналогіямі, а таксама абсталяваннем і матэрыяламі, неабходнымі для яе вытворчасці.

Адзначаецца, што ўмовы, пры якіх можа быць прыменена ядзерная зброя, — прымяненне або незваротная пагроза прымянення ядзернай зброі супраць КНДР, напад на кіраўніцтва краіны, у тым ліку з выкарыстаннем няядзернай зброі, ваенная атака на важныя стратэгічныя аб'екты. Ядзерную зброю могуць выкарыстоўваць таксама пры неабходнасці прадухіліць зацягванне ваенных дзеянняў або каб забяспечыць ініцыятыву.

# З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, СТАЛІЦА!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Першыя актыўнасці пачаліся на сталічных пляцоўках за тыдзень, ужо 3 верасня. У гэты дзень у кожным раёне сталіцы адбыліся мерапрыемствы пад назвай «Мінск сямейны». Тым часам Беларускі дзяржаўны цырк ладзіць Дзень адчыненых дзвярэй. Наведвальнікам раскрываюць таямніцы цыркавога мастацтва, ім прапануюць прайсці нескладаныя майстар-класы, пагутарыць з артыстамі, паўдзельнічаць у інтэрактывах.

Некаторыя сталічныя музеі арганізоўваюць для вучняў, жыхароў і гасцей Мінска бясплатныя наведванні сваіх экспазіцый. Мабыць, адзін з самых цікавых тэматычных блокаў запланаваны ў Музеі гісторыі горада Мінска. У адрэстаўраваным будынку, што на вуліцы Ракаўскай, можна азнаёміцца з экспазіцыяй «Маё імя — Мінск». Экспазіцыя распачала работу ўчора.

Прапануюць мінчанам і гасцям горада спартыўныя забавы. Напрыклад, прэзентуюць чарговы маршрут «Дарогай памяці». Тым, у каго веласіпеда няма, дадзеную лакацыю можна даследаваць пешшу. Знаходзячыся ў цэнтры горада, абавязкова зазірніце на Кастрычніцкую плошчу. На ёй гарадскія ўлады зладзяць выставу з прэзентацыяй дасягненняў сталічных прамысловых прадпрыемстваў.

## Святкуем Дзень горада 10 і 11 верасня

Першы дзень масавых гулянняў пачнецца з гістарычнай рэканструкцыі. У Траецкім прадмесці арганізуюць «вернісаж». Тут адновяць атмасферу XIX стагоддзя, а на гандлёвых радах выставяць карціны і іншыя прадметы мастацтва. У якасці актыўнасцяў на «вернісажы» можна будзе паўдзельнічаць у літаратурных чытаннях, зрабіць здымак у спецыяльнай фотазоне і паслухаць вулічных музыкантаў.

У сталічных тэатрах адбудуцца дні адчыненых дзвярэй. Наведвальнікі змогуць пагутарыць з акцёрамі і рэжысёрамі, зазірнуць у закулiссе храмаў мастацтва.

Самая ж маштабная дзея разгорнецца каля Палаца спорту. Тут адбудзецца Міжнародны Алімпійскі дзень. Мінчанам і гасцям сталіцы прапануюць прайсці спартыўны квэст. Паралельна ўдзельнікаў і гледачоў будуць забаўляць папулярныя беларускія выканаўцы і гурты. Прадставяць свае пляцоўкі і сілавікі. Сталічныя ратавальнікі арганізуюць міжнародныя старты пад назвай «Наймацнейшы пажарны-ратавальнік». Будуць функцыянаваць пляцоўкі і ад сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі.

10 верасня ў музейна-паркавым комплексе «Перамога» запланаваны фестываль «Мінск маладзёжны». Арганізуюць актыўнасці і для аматараў гастраноміі. У Верхнім горадзе адбудзецца фестываль беларускай кухні.

Апагеем жа свята стане цырымонія ўручэння ўзнагарод «Мінчанін года», «Найлепшы па прафесіі» і «Мінскі майстар». Адбудзецца мерапрыемства ў парку імя Янкі Купалы. Адразу пасля ўручэння ўзнагарод гледачоў чакае святочны канцэрт, а ў 23.00 — маляўнічы феерверк. Яго можна будзе ўбачыць каля Палаца спорту.

Некаторыя мерапрыемствы адбудуцца 11 верасня. У прыватнасці, гаворка аб знакавым Мінскім паўмарафоне, у якім традыцыйна возьмуць удзел дзясяткі тысяч спартсменаў і аматараў не толькі з Беларусі, але і іншых краін.

## 27 адкрытых святочных пляцовак

Пра гэта распавёў **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Арцём ЦУРАН.**

— Сёлета канцэпцыя Дня горада мае на ўвазе раскрыццё шматграннасці Мінска. Урачыстасці пройдуць пад дэвізам «Мінск рознабаковы, але ўсе мы — яго жыхары», — адзначыў Арцём Цуран.

Ён звярнуў увагу, што ва ўрачыстасцях, прысвечаных 955-годдзю сталіцы, будуць задзейнічаны такія пляцоўкі, як «Мінск маладзёжны», «Мінск гістарычны», «Мінск спартыўны», «Мінск музычны», «Мінск гасцінны» і іншыя.

— Акрамя агульнагарадскіх мерапрыемстваў, святы пройдуць у кожным раёне сталіцы, — падкрэсліў намеснік старшыні Мінгарвыканкама. — Мы хочам паказаць, які наш горад прыгожы, зручны, бяспечны і рознабаковы.

## У Парку Перамогі — спартыўна і музычна

Галоўнай раённай пляцоўкай святкавання Дня горада стане бераг Камсамольскага возера з боку пр. Пераможцаў. У 12.00 у парку разгорнецца шырокая забаўляльная праграма. Пра гэта расказала **начальнік упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі адміністрацыі Цэнтральнага раёна Вольга ТУКАЙ.**

Адкрые свята народная зарадка, да якой далучыцца студэнцкая і працоўная моладзь. Тут жа адбудзецца турнір па ўсходніх відах адзінаборстваў, футбольны фрыстайл, майстар-клас па масрэслінгу (нацыянальны від спорту Якуціі, утвораны ад традыцыйнай гульні ў перацягванне палкі). Спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву па скачках на батуце і акрабатыцы арганізуе работу сваёй пляцоўкі для спартыўна-масавых мерапрыемстваў «Рабі з намі, рабі, як мы, рабі лепш за нас!».

Танцы вам падабаюцца больш, чым спорт? Тады абавязкова зазірніце на танцавальны флэшмоб, удзельнікі якога выканаюць сальсу і ча-ча-ча.

Юным гасцям свята абавязкова прыйдзецца даспадобы Хагі-квэст, які таксама абяцаюць арганізаваць у Парку Перамогі. Не дадуць засумаваць і акцёры ў касцюмах любімых многімі дзецьмі мультперсанажаў Хагі Вагі і Кісі Місі.

На раённай святочнай пляцоўцы правесці час можна будзе не толькі весела, але і з карысцю. Напрыклад, навучыцца рукадзеллю дапамогуць арганізатары майстар-класа «Гарошак-маркет», а Цэнтральная раённая арганізацыя аб'яднання «Белая Русь» на сваёй інфармацыйна-інтэрактыўнай пляцоўцы прэзентуе ўсім жадаючым «Даведнік па любімай сталіцы».

Своеасаблівая рэпетыцыя святкавання юбілею прайшла ў раёне ў мінулую суботу. У парку імя Янкі Купалы адбыўся сямейны фэст з квэстамі, майстар-класамі і танцавальным флэшмобам. Тут сваю выставу арганізаваў музей беларускага класіка. Таксама адбыліся паказальныя выступленні па таэквандо, разборцы і зборцы зброі. Удзельнікаў чакалі канцэртная праграма і розыгрыш прызоў і падарункаў.

## Знайсці хобі і заняцца водным турызмам. У Дзень горада дзяцей чакае шмат цікавага

Да Дня горада ўстановы адукацыі сталіцы падрыхтавалі для школьнікаў і іх бацькоў вялікае свята. Забаў прапануюць шмат, прычым разнастайных і карысных. Таму 10 верасня ўсіх запрашаюць у Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі.

Гулянне пачнецца на пляцоўцы каля палаца. Можна будзе пазнаёміцца з работай гурткоў, якія адкрыты ва ўсіх раёнах сталіцы, і тут жа запісацца. У гэты дзень прадставяць сваю дзейнасць 22 установы дадатковай адукацыі — знайсці хобі будзе лёгка.

На вуліцы таксама разгорнецца кірмаш «Горад майстроў», дзе раменнікі пакажуць сваю прадукцыю, выкананую ўручную.

У памяшканні палаца адкрыецца фотавыстава «Погляд з мінулага ў будучыню». Госці свята ўбачаць экспазіцыю чорна-белых здымкаў славутасцяў, культурных аб'ектаў, помнікаў архітэктуры горада.

Ужо 9 верасня ганаровая вахта памяці ўступіла на пост № 1 Мінска. Каля Вечнага агню — сталічныя школьнікі і гімназісты. Сёлета да іх далучацца мемарыяльныя атрады Мінскага гарадскога кадэцкага вучылішча і ліцэя МУС Рэспублікі Беларусь.




## Паплаваць на байдарках

Свята будзе суправаджацца канцэртнай праграмай «Табе, родны Мінск, прысвячаем...» Выступяць найлепшыя дзіцяча-маладзёжныя творчыя калектывы. Свае ўменні прадэманструюць і вучні-спартсмены.

Для тых, хто жадае актыўна правесці час, атрымаўшы дозу адрэналіну, рэкамендуем сплаў на байдарках. Каля палаца на Камсамольскім возеры можна бясплатна пакатацца. Актыўнасць арганізуе турысцка-экалагічны цэнтр дзяцей і моладзі.

Сплавы запланаваныя на 13.00, 14.00 і 15.00. Інструктары папярэдне правядуць навучанне і абавязкова будуць суправаджаць юных спартсменаў падчас падарожжа. Дарэчы, пасля прабнага занятку можна запісацца і ў адпаведны гурток, дзе не толькі навучаць парамайстэрску кіраваць байдаркамі і варочаць вёсламі, але і распальваць вогнішча адной запалкай, і правільна ўстанаўліваць палатку.

А яшчэ можна будзе паўдзельнічаць у якасці гледача ў фестывалі вулічных культур. Спецыяльную пляцоўку каля палаца арганізуюць для скейтараў, ролераў, велатрыялістаў. Яны пакажуць галавакружныя скачкі, здзівяць неверагоднымі трукамі.

## Стварыць робата

У сценах палаца пройдуць майстар-класы «IT-школа» для дарослых. Асабліва карыснымі яны стануць для настаўнікаў. Педагогаў навучаць распрацоўваць адукацыйныя чат-боты, ствараць аб'екты дапоўненай рэальнасці і рабатызаваныя мадэлі, выкарыстоўваць на ўроках тэхналогіі скрайбінгу.

Таксама будзе арганізавана арыгінальная фотазона: на адным банеры змесцяць усе эмблемы школ і гімназій Мінска. А іх больш за 240.

Камбінат школьнага харчавання горада Мінска правядзе прэзентацыю прадукцыі «Школьны буфет». Можна будзе пакаштаваць найлепшыя стравы са школьнага меню.

## Зняцца ў кіно

Для ўдзельнікаў свята арганізуюць работу тэлестудыі. Кожны жадаючы можа зняцца ў відэасюжэце — запісаць на камеру віншаванне для любімага горада. У канцы дня ўсе ролікі змантыруюць у адзін фільм. Пасля плануецца прадставіць стужку шырокай публіцы.

У Дзень горада ва ўсіх кінатэатрах сталіцы пройдуць тэматычныя паказы «Мінск шматаблічны».

Можна паўдзельнічаць і ў стварэнні святочнага арт-банера «Мой любімы горад», зрабіць сваімі рукамі крэатыўную паштоўку ў тэхніцы гратаж.

## Заапарк запрашае адзначыць 955-годдзе Мінска

У Мінскім заапарку 10 верасня адсвяткуюць Дзень горада. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе ўстановы.

З 11.00 да 14.00 наведвальнікаў на інтэрактыўных пляцоўках чакаюць розныя гульні: твістар, заахакей, Angry Birds, крыжыкі-нулікі, «Поле цудаў». Таксама будзе працаваць творчая зона «Будуем горад мары». З 14.00 да 15.00 можна будзе паглядзець выступленне гуртка верхавой язды «Коні і поні». Таксама на працягу дня госці заапарка змогуць паназіраць за пакаральнымі кармленнямі жывёлін.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# У Мінску з удзелам прадстаўнікоў чэшскай грамадскасці ўшанавалі памяць Івана Міранкова

**Напярэдадні Дня танкіста, 9 верасня, на Усходніх могілках г. Мінска адбылося ўскладанне кветак да помніка Героя Савецкага Саюза Івана Міранкова. Асаблівасць цырымоніі ў тым, што ў ёй узяла ўдзел дэлегацыя з Чэшскай Рэспублікі. Больш за тое, менавіта чэшскі бок выступіў ініцыятарам гэтага мерапрыемства.**


Выступіў Радэк ГАРАШТА.

Справа ў тым, што падчас Вялікай Айчыннай вайны ў баі за чэшскае сяло Старавічкі Іван Міранкоў з узводам знішчыў шэсць танкаў і самаходных установак, дзве гарматы, каля 50 салдат і афіцэраў праціўніка. Менавіта гэта дапамагло прасоўванню наперад часцей брыгады.

Падчас мерапрыемства кіраўнік клуба ваеннай гісторыі Старавічкі Радэк Гараштa запэўніў, што чэхі і, у прыватнасці, жыхары сяла, дзе вызначыўся Іван Міранкоў, да гэтага часу шануюць памяць героя і памятаюць яго подзвіг. І гэта не пустыя словы: калі ўязджаеш у Старавічкі, нельга не заўважыць помнік у выглядзе танка Т-34-85 з нумарам 200 на пастаменце, які дагэтуль даглядаюць жыхары сяла.

Таксама ўшанаваць памяць героя-танкіста прыйшлі прадстаўнікі Міністэрства абароны Беларусі, пасольства Расійскай Федэрацыі, кіраўніцтва фонду «Памяць Афгана» і ГКК «Лінія Сталіна», члены клуба «Салдаты Перамогі», навучэнцы 18-й гімназіі.



Варта адзначыць, што школьнікі заявілі аб намеры змагацца за прысваенне навучальнай установе імя Івана Міранкова, бо подзвіг танкіста, яго жыццёвы шлях сталі для іх прыкладам службы Айчыне і выканання ваенна-патрыятычнага абавязку.

Падчас мітынга-рэквіема была здзейснена памінальная літыя, было сказана нямала слоў пра патрыятызм і важнасць ушанавання гістарычнай памяці. У канцы ўсе прысутныя ўсклалі кветкі да помніка Героя Савецкага саюза Івана Міранкова.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

# ЧАС ДРУГОГА ХЛЕБА

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

З прыходам восені селекцыянеры таксама капаюць бульбу — але, у адрозненне ад дачнікаў, не на дранікі і пюрэ, а з навуковымі мэтамі.

— Сёння на заключным этапе выпрабаванняў у мяне — 44 гібрыды бульбы, — распавядае **галоўны навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі бульбы НПЦ НАН Беларусі па бульбаводстве, доктар сельскагаспадарчых навук Георгій ПІСКУН.** — Атрыманым клубням будзе дадзена поўная ацэнка па 58 прыкметах. І значную частку гібрыдаў непазбежна адбракуем.

Працэс выпрабавання гібрыда — ад скрыжоўвання да перадачы ў Дзяржкамісію — займае дзевяць гадоў. І калі на пачатковым этапе высаджваецца каля 100 тысяч узораў, то ў канцы селекцыйнага працэсу толькі некалькі з гэтай колькасці зможа прэтэндаваць на права называцца новым сортам. Далей — тры гады ацэнкі выніку намаганняў селекцыянераў Дзяржаўнай інспекцыяй па выпрабоўванні і ахове сартоў раслін. І толькі потым (калі рашэнне Дзяржкамісіі будзе станоўчым) сорт трапіць у Дзяржаўны рэестр — адзіны банк даных аб сартах сельскагаспадарчых раслін, якія прайшлі ўсе выпрабаванні і дапушчаны для вытворчасці, рэалізацыі і выкарыстання іх насення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Так выглядае селекцыйны працэс.

## Задачы селекцыі, або Чаго хоча спажывец

Напрамкаў, па якіх вядзецца сёння селекцыя бульбы ў Беларусі, некалькі. У гэтых жа напрамках вядзецца сучасная селекцыя бульбы і ў іншых краінах.

— Адзін з іх — стварэнне новых сартоў для вытворчасці крухмалу, — адзначае Георгій Іванавіч. — Відавочна, тут асноўныя прыкметы, па якіх вядзецца селекцыя, — утрыманне крухмалу ў клубнях ды ўраджайнасць. А форма клубняў і іх памер не настолькі важныя.

Другі напрамак селекцыі — стварэнне сартоў для перапрацоўкі на бульбапрадукты, тлумачыць суразмоўнік. У ЗША, напрыклад, на чыпсы, бульбу фры, ачышчаную бульбу ў вакуумнай упакоўцы (паўфабрыкат для занятых гаспадынь) адпраўляецца больш за 60 % усяго ўраджаю бульбы. У нас гэтая доля значна меншая, але і ў Беларусі патрэба ў такіх прадуктах высокая.

— І тут для кожнага прадукту — свае патрабаванні да сартоў бульбы, — тлумачыць спецыяліст. — Напрыклад, для чыпсаў памер клубня павінен быць не больш за 60 см у дыяметры. Клубні павінны быць круглымі — так чыпсы атрымаюцца звыклай і зручнай для спажывання формы. Для вытворчасці бульбы фры патрэбныя доўгія клубні аднолькавага памеру — каля 9 см у даўжыню. Але для ўсіх сартоў, якія выкарыстоўваюцца прамысловасцю ў вытворчасці бульбапрадуктаў, асноўнае патрабаванне — нізкае ўтрыманне рэдукавальных цукраў: не больш за 0,2 %. У адваротным выпадку, кажа спецыяліст, бульбапрадукты набудуць непрыгожы цёмны колер і будуць падгараць.

Трэці напрамак селекцыі — выкарыстанне бульбы непасрэдна ў кулінарных мэтах. Тут запатрабаваныя, з аднаго боку, раннія сарты (тыя, якія «з градкі — на стол, варыць у лупіне і пасыпаць кропчыкам»), і з другога — сарты для працяглага захоўвання. У асноўным сярэдняспелыя і сярэдняпозныя сарты: раннія пры доўгім захоўванні губляюць смакавыя якасці, позныя — не выспяваюць (ім не хапае ў нас цяпла на ўвесь перыяд вегетацыі).

Ну, а на смак і колер, як той казаў, таварышаў няма. Даспадобы вам цвёрдзенькія клубні салатнага тыпу (еўрапейскі варыянт) або, наадварот, больш разварыстая «беларуская класічная» бульбачка, селекцыянеры ствараюць і тыя, і другія сарты.

— Найважнейшае патрабаванне для сталовых сартоў — прывабны вонкавы выгляд, — прызнае навуковец. — У першую чаргу запыт спажыўца сёння — каб бульба добра выглядала на вітрыне: гладкая лупіна, дробныя «вочкі», круглявая або круглява-авальная форма клубня.

І, нарэшце, яшчэ адзін сучасны напрамак селекцыі бульбы — сарты для здаровага харчавання.

— Гэта ў першую чаргу павышанае ўтрыманне біялагічна каштоўных рэчываў: бялку, вітаміну С і антыаксідантаў, — адзначае суразмоўнік.

Праўда, «данесці да рота» вітамін С, які змяшчаецца ў бульбе, досыць складана, бо каля паловы яго пры тэрмічнай апрацоўцы страчваецца.

— Аптымальны спосаб захаваць вітамін С у бульбе — варыць яе «ў мундзірах» або запякаць у лупіне, — раіць Георгій Іванавіч.

А вось антыаксіданты ў значнай колькасці (ад 60 да 90 %) бульба захоўвае і пасля варэння або смажання. Антыаксідантамі надзвычай багатыя сарты з фіялетавай і чырвонай мякаццю. Сорт з фіялетавай мякаццю «Сапфір» сёння знаходзіцца на дзяржаўным сортавыпрабаванні. Створаны і гібрыд з ярка-чырвонай мякаццю — яго плануюць перадаць у Дзяржкамісію ў хуткім часе.

Што датычыцца ўтрымання крухмалу, згодна з сучаснымі нормамі, для сталовых сартоў аптымальныя 15 %, а ў сартах для дыетычнага харчавання гэтага рэчыва дапушчальна не больш за 10 %.

Неўзабаве агароднікі змогуць ацаніць некалькі новых сартоў айчыннай селекцыі, распавялі ў НПЦ бульбаводства.

— Завяршаецца выпрабаванне сорту «Водар» — рашэнне па ім Дзяржаўная камісія будзе прымаць ужо сёлета. Другі год выпрабоўваюцца сарты «Дзясятка», «Баярскі» і фіялетавы сорт «Сапфір» (яго асабліва чакаюць дачнікі). Сёлета перададзеныя на сортавыпрабаванне і два ранніх сарты — «Красавік» з ружовымі клубнямі і сорт з белай мякаццю «Умка».

## Капаем і захоўваем «па навуцы»

У прыгатаванні простых і звыклых страў з бульбы, на самай справе, шмат, здавалася б, нязначных, але вельмі важных нюансаў. І перш за ўсё, ролю адыгрывае правільны выбар сорту бульбы для кожнай стравы. На супы і салаты з ужо раяніраваных сартоў выдатна падыдзе той жа «Скарб» і новы ранні сорт «Першацвет», кажа Георгій Іванавіч. А «Вектар» і «Гарантыя» ідэальныя, каб іх смажыць.

Само слова «бульба», дарэчы, — не зусім беларускае. Яго корань — лацінскі (па латыні bulbus — цыбуліна), як у многіх слоў, што ўспрымаюцца сёння як спрадвечна беларускія. Ды і наогул бульба на беларускай зямлі стала другім хлебам адносна нядаўна. Папулярнасць яна набыла толькі ў дваццатыя—трыццатыя гады мінулага стагоддзя. У часы калектывізацыі зямлі ў сялян стала настолькі мала, што вырошчванне пшаніцы страціла сэнс — усё роўна гэтым ураджаем было не пракарміцца. А вось некалькі «сотак» бульбы дазвалялі сям'і пратрымацца зіму, пішуць гісторыкі. Традыцыйную закупку бульбы «на зіму» сучасным гараджанінам псіхолагі, напэўна, расцанілі б як несвядомыя адгалоскі тых далёкіх часоў. Іншая справа, што ў кватэры наўрад ці магчыма захаваць бульбу без страт.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Для зімовага захоўвання аптымальныя сярэдняспелыя і сярэдняпозныя сарты — напрыклад, тыя ж «Вектар», «Рагнеда». Праўда, важна разумець, што менавіта гэтыя сарты зусім не падыходзяць для захоўвання пры павышанай тэмпературы. Ім трэба забяспечыць тэмпературны рэжым у 2-3 градусы, і не вышэй. Інакш яны прарастаюць, і ў гэтым іх недахоп. З новых сартоў добрай лёжкасцю і смакавымі якасцямі характарызуюцца ранні сорт «Першацвет», сярэднаспелыя «Лель» і «Гарантыя», сярэднязпозні «Рубін».

Лепш захоўваецца правільна выкапаная бульба, адзначае суразмоўнік. Бульбоўнік варта скасіць у момант натуральнага завядання, і тыдні два пасля гэтага пачакаць, каб у бульбы ў зямлі адужэла лупіна. Выкапаўшы, бульбу не варта адпраўляць на захоўванне адразу — правільна будзе змясціць яе ў зацемненае месца тыдні на два (тэмпература — каля 15 градусаў). За гэты час выявяцца хваробы клубняў, і падгнілыя адзінкі можна будзе выдаліць. Перабраўшы, бульбу закладваюць у склеп на захоўванне.

Гараджаніну разумна трымаць запас бульбы на зіму, напрыклад, у гаражы, калі ён у вас ёсць і ў ім ёсць склеп. А вось у кватэры захоўваць бульбу практычна нерэальна, кажа спецыяліст. Ні на балконе, ні на лесвічнай клетцы, ні тым больш на кухні не атрымаецца забяспечыць патрэбны тэмпературны рэжым.

## Насуперак капрызам надвор'я

— Цяпер клімат стаў вельмі кантрасным, — расказвае доктар сельскагаспадарчых навук. — Перыяды павышанай тэмпературы і засухі чаргуюцца з выпадзеннем моцных кароткачасовых ападкаў. Халодная вясна, вельмі гарачае лета і рэзкае пахаладанне з прыходам восені плюс нераўнамернае выпадзенне ападкаў, залівыя дажджы — такія ўмовы неспрыяльныя для бульбы.

І ў гэтым кірунку сёння таксама ідзе селекцыя, адзначае Георгій Іванавіч: неабходныя сарты, устойлівыя да капрызаў надвор'я і новых для нашых шырот хвароб.

— Асноўны напрамак работы цяпер — вывядзенне сартоў, устойлівых да засухі, высокіх тэмператур, а таксама часовага пераўвільгатнення глебы. І самае галоўнае — да хвароб раслін, якія раней не былі характэрныя для Беларусі. У сувязі з пацяпленнем клімату рэзка абвастрылася шкоднасць хвароб, што ў мінулыя часы фактычна не мелі ў нашых шыротах ніякага значэння. У прыватнасці, гэта альтэрнарыёз бульбы — цяпер ён па шкоднасці знаходзіцца на ўзроўні фітафтарозу. Але калі фітафтароз актыўна развіваецца пры павышанай вільготнасці ў спалучэнні з невысокімі тэмпературамі, то альтэрнарыёз размнажаецца пры высокіх тэмпературах і недахопе вільгаці.

Атрымліваць годны ўраджай у новых кліматычных умовах становіцца больш складана, адзначае навуковец, а селекцыянерам, ствараючы новыя сарты, даводзіцца ўлічваць усё больш патрабаванняў. І ўсё ж бульба па-ранейшаму застаецца ў нас другім хлебам: у Беларусі ў сярэднім з гектара атрымліваюць каля 30 тон.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»**
(222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б)
**проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

<u>лот № 1:</u> **здание гаража, общей площадью 1223 кв. м с инв. № 630/С-79859, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б/1 (далее – Объект).**

**Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 623850100002004253 (право постоянного пользования) площадью 4,6001 га, для обслуживания Объекта будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

*Земельный участок имеет ограничения прав: охранная зона линий электропередачи, пл. 0,0808 га, охранная зона магистральных трубопроводов, пл. 0,9286 га.*

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 88 800,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **8 880,00** бел. руб.
Цена снижена на 60 %.

<u>Лот № 2:</u>

**• крытая крановая эстакада общей площадью 1162,8 кв. м, с инв. № 630/С-42062, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/9;**

**• сборно-тросcовая мастерская общей площадью 577,4 кв. м, с инв. № 630/С-42061, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/8.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 129 960,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **12 996,00** бел. руб.
Цена снижена на 50 %.

<u>Лот № 3:</u>

**• цех металлообработки № 2** *(составные части и принадлежности: пристройка, навес, дымовая труба)* **общей площадью 1222,0 кв. м с инв. № 630/С-46869, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/4;**

**• здание склада нефтепродуктов с инв. № 630/С-46865, общей площадью 47 кв. м, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/6.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

**Объекты обременены договорами аренды (сведения можно получить у Организатора торгов).**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 85 428,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **8 542,00** бел. руб.
Цена снижена на 70 %.

<u>Лот № 4:</u>

**цех металлообработки № 1** *(составные части и принадлежности: пристройка, 2 (два) навеса)* **общей площадью 1740 кв. м с инв. № 630/С-46860, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/3.**

**Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 387 840,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – (**38 784,00** бел. руб.).
Стоимость снижена на 20 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, код платежа 40901, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. <u>Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %)</u> (покупатель) <u>**возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**</u>

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 02.04.2022, 11.05.2022, 02.06.2022, 02.07.2022, 26.07.2022, 16.08.2022 (по лотам №№ 1,2), 27.01.2022, 02.04.2022, 19.04.2022, 11.05.2022, 02.06.2022, 02.07.2022, 26.07.2022, 16.08.2022 (по лоту № 3), 28.06.2022, 16.08.2022 (по лоту № 4).

Аукцион состоится **29.09.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.09.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра: 8 (029) 351 10 33.**

УНП 600077220

---

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390** |
| **Продавец** | **ОАО «Минскремстрой», г. Минск, ул. Интернациональная, д. 5, УНП 100056308** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. УНП 191224638** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронного аукциона (одним лотом)**
**Адрес: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 70А, 70А/1**

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инвен. номер |
|---|---|---|---|
| **Здание производственно-бытового корпуса** | Здание специализированное иного назначения | **1 871,2 кв. м** | 500/С-15435 |
| **Аккумуляторная** | Здание неустановленного назначения | **50 кв. м** | 500/С-39074 |

Составные части и принадлежности: площадка, ограждения, бордюр, ворота, калитка

В состав лота входит оборудование: **кран-балка** (инв. № 01-450811), **кран подвесной 1т** (инв. № 01-400012)

***Сведения о земельном участке:*** пл. 0,5704 га предоставлен для размещения объектов иного назначения на праве долевой аренды (доля продавца 18/25, срок действия по 31.03.2032). Ограничения (обременения) прав на земельный участок: охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,1575 га). После продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

***Обременения:*** площади здания частично сданы в аренду

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 412 300,89 бел. руб.** (снижена на 10 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 18.08.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 11.00 13.10.2022. Окончание торгов: 12.00 13.10.2022.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 12.10.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, <u>**BELTORGI.BY**</u>

Продавец: **УП «Комбинат декоративно-прикладного искусства им. А.М. Кищенко»** (УНП 600126458), 222520, г. Борисов, ул. Блюхера, 19, тел. 8 033 688 86 54, в лице ликвидатора ООО «Правовая компания «Делегат».

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **28 сентября 2022 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке <u>**BELTORGI.BY**</u>.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Гараж, инв. № 1-005, общ. пл. 114 кв. м, механические мастерские и склады, инв. № 01-008, общ. пл. 337 кв. м, производственный корпус керамического цеха, инв. № 01-010, общ. пл. 4027,0 кв. м, производственный корпус № 01-003, столовая комбината, инв. № 01-03а, общ. пл. 3000,1 кв. м, проходная, инв. № 01-006 (задняя). Проходная центральная, инв. № 01-013, общ. пл. 13 кв. м, склад, инв. № 01-009, склад материальных ценностей, инв. № 01-017, общ. пл. 184 кв. м, склад материальных ценностей, инв. № 01-012, общ. пл. 103,7 кв. м, художественные мастерские, инв. № 01-002, общ. пл. 996 кв. м, г. Борисов, ул. Блюхера, 19 | 1 508 751,65 |
| 2 | Станок гончарный, инв. № 191 | 120,00 |
| 3 | Станок гончарный, инв. № 192 | 120,00 |
| 4 | Станок гончарный, инв. № 192-1 | 120,00 |
| 5 | Станок гончарный, инв. № 192-2 | 120,00 |
| 6 | Промышленная швейная машина Global ZZ 217-3S (Голландия), инв. № 606 | 900,00 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529-698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок <u>с 12.09.2022 г. с 09.00 по 27.09.2022 г. до 17.00:</u>** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте <u>BELTORGI.BY</u>; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену за лот. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 19.07.2022 г.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Организатор: Государственное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска»,
220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375173649127

Торги проводятся **07.10.2022 г.** ЭТП «БУТБ-Имущество», www.et.butb.by.

**Л/АВТОМОБИЛЬ SAMAND,**
**2010 г., черный – 3 375 BYN**

Окончание приема заявлений – 04.10.2022, до 15.00.
Подробная информация на сайте **www.et.butb.by**

УНП 192605364

---

27.09.2022 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня

1) О внесении и утверждении изменений в устав общества.
2) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Дата сбора реестра акционеров – 20.09.2022 г.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 20.09.2022 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

---

Идентификационную пластиковую карточку № АВ 0022044 риэлтора по операциям с недвижимостью ООО «Мариэлт» на имя Дьяченко Дмитрия Евгеньевича **считать недействительной в связи с утерей**. УНП 192776463

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3»

## <u>28 сентября 2022 года в 11.00</u> ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| № п/п | Наименование имущества | Начальная цена продажи без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот 1 | Автомобиль «VAZ-21150», тип ТС — легковой специальный седан (SEDAN), номер кузова (vin) XTA21150033475295, цвет – серебристо-желто-зеленый, год выпуска – 2003, регистрационный знак 5540 ВВ-6, инвентарный номер – 2052 | 1 080,00 | 108,00 |
| Лот 2 | Автомобиль «VOLKSWAGEN JETTA», тип ТС – легковой специальный седан (SEDAN), номер кузова (vin) WVWZZZ1KZ7M0844421, цвет – серебристый металлик, год выпуска – 2006, регистрационный знак 5619 АС-6, инвентарный – 1414 | 8 280,00 | 828,00 |
| Лот 3 | Автомобиль «GAZ-3110», тип ТС – легковой специальный седан (SEDAN), номер кузова (vin) XTH31100031164782, цвет – серебристый металлик, год выпуска – 2003, регистрационный знак 5481 TAI, инвентарный номер – 1305 | 990,00 | 99,00 |
| Лот 4 | Автомобиль «SKODA OCTAVIA A5», тип ТС – легковой седан (SEDAN), номер кузова (vin) TMBBK41Z282202054, цвет – серебристый металлик, год выпуска – 2008, регистрационный знак 3658 ВВ-6, инвентарный – 859 | 6 390,00 | 639,00 |
| Лот 5 | Автомобиль «CHEVROLET NIVA 212300-55», тип ТС – легковой автомобиль внедорожник универсал (SUV UNIVERSAL), номер кузова (vin) X9L212300C0414126, цвет – светло-серебристый металлик, год выпуска – 2012, регистрационный знак 9593 ЕВ-6, инвентарный номер – 861 | 6 750,00 | 675,00 |
| Лот 6 | Автомобиль «UAZ 31519», тип ТС – легковой автомобиль внедорожник универсал (SUV UNIVERSAL), номер кузова (vin) XTT31519040576923 (31510040594871), цвет – темно-зеленый, год выпуска – 2004, регистрационный знак 2754 ЕВ-6, инвентарный номер – 860 | 2 970,00 | 297,00 |
| Лот 7 | Автомобиль «CITROEN C5», тип ТС – легковой специальный хэтчбек, номер кузова (vin) VF7DCRHZB76067682, цвет – серебристый, год выпуска – 2001, регистрационный знак 9737 АТ-6, инвентарный номер – 820 | 5 220,00 | 522,00 |
| Лот 8 | Автомобиль «ШКОДА СУПЕРБ», тип ТС – легковой специальный седан, номер кузова (vin) TMBBL23U189009856, цвет – серебристый металлик, год выпуска – 2007, регистрационный знак 1900 АХ-6, инвентарный номер – 70326 | 7 470,00 | 747,00 |
| Лот 9 | Автомобиль «GEELY EMGRAND X7», тип ТС – легковой специальный универсал (UNIVERSAL), номер кузова (vin) Y4K8762ZXFB009446, цвет – черный, год выпуска – 2015, регистрационный знак 0664 ЕТ-6, инвентарный номер – 4251 | 17 715,77 | 1771,58 |
| Лот 10 | Автомобиль «GEELY EMGRAND X7», тип ТС – легковой внедорожник универсал (SUV UNIVERSAL), номер кузова (vin) Y4K8762Z6FB009430, цвет – черный, год выпуска – 2015, регистрационный знак 9058 ЕС-6, инвентарный номер – 632 | 10 888,61 | 1088,86 |
| Лот 11 | Автомобиль «KIA SPORTAGE», тип ТС легковой специальный внедорожник универсал (suv universal), год выпуска – 1997, регистрационный знак – 0268 ЕТ-6, кузов (рама) № KNEJA5535V5416442, цвет ТС – темно-зеленый, инвентарный номер – 14930 | 2400,00 | 240,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **28 сентября 2022 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

3. Местонахождение имущества: г. Могилёв, Славгородский проезд 17.

4. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

5. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

*Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.*

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **22.09.2022 г., время: 17.00.**

7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

8. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

9. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

10. Ссылка на ранее опубликованное извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» – в газете «Звязда» по лотам №№ 1–10 16.06.2022, по лоту № 11 17.05.2022, а также на сайте ОАО «ДСТ № 3».

**Сяргей МАКАРАНКА:**

# «ЗА ДЫСТАНЦЫЮ ПЕРАД ВАЧЫМА МОЖА ПРАЛЯЦЕЦЬ УСЁ ЖЫЦЦЁ»

**Вайна, пасляваенная разруха, цяжкая праца з 17 гадоў, алімпійская перамога, паспяховая трэнерская работа, дзейнасць у прадстаўніцтве НАК у Мінску — гэта ўсё біяграфія аднаго чалавека — Сяргея Лаўрэнцевіча Макаранкі.**

**Шлях да алімпійскіх вяршынь ніколі не бывае лёгкім. І першыя ў гісторыі беларускага спорту алімпійскія чэмпіёны Сяргей Макаранка і Леанід Гейштар — самы яркі таму прыклад. «Умовы? Ды якія там умовы! Паесці б удосталь — і тое шчасце было!» — успамінаў Сяргей Лаўрэнцевіч у інтэрв'ю. Але нават складанасці, якія сучаснаму пакаленню спартсменаў могуць падацца катастрафічнымі, не зламалі любоў да веславання. А яна прывяла яго да найвышэйшых спартыўных узнагарод. 11 верасня Сяргей Лаўрэнцевіч Макаранка святкуе 85-гадовы юбілей. Спартсмен адзін раз — назаўсёды спартсмен. Салідную дату чэмпіён сустракае ў выдатнай фізічнай форме, бадзёрым настроі і з нязменнай любоўю да спорту. Цікава, а якія яго моцныя думкі?**



Фота Лізаветы ГОПАД.

**Памятаю, як немцы бамбілі Брэсцкую крэпасць, дзе служыў мой бацька.** Нас у бацькоў было трое хлопчыкаў: Воўка на год старэйшы, я і Лёнька, на два гады малодшы за мяне. Калі 22 чэрвеня 1941 года пачалася бамбёжка, мама схапіла нас, і мы пабеглі ў падвал. Памятаю, як спачатку бабахне, а потым са столі тынкоўка сыплецца. Калі наступіла зацішша, мама схапіла нас і выскачыла на вуліцу. А тут зноў бамбёжкі пачаліся. На шчасце, нас убачыла дворнічыха і загнала зноў у падвал. Бацьку мы больш ніколі не бачылі, ён застаўся ў крэпасці.

**Мы першымі ўбачылі руіны крэпасці.** Пасля вайны мы, пацаннё, прабіраліся на руіны Брэсцкай крэпасці. Там усё было вывернута, засталіся толькі падземныя хады. Мы, хлапчукі, першымі ўбачылі гэтыя знакамітыя надпісы: «памром, але з крэпасці не пойдзем», «паміраю, але не здаюся» — выдрапаныя на сценах, напісаныя крывёй.



«Залаты» заплыў: С. Макаранка і Л. Гейштар.

**Я не быў спартсменам і ні пра якое веславанне не думаў.** Да вайны ў Брэсце былі тры лодачныя станцыі, пабудаваныя яшчэ за польскім часам. Адну разбамбілі падчас авіяналёту проста ў нас на вачах. Але яшчэ адна станцыя на Мухаўцы засталася практычна цэлай. Я не быў спартсменам, вучыўся, удзельнічаў у школьных мерапрыемствах. Ні аб якім веславанні нават і не думаў. Пакуль у горадзе не з'явіўся трэнер Уладзімір Піліпенка. Ён быў бухгалтарам, працаваў у будаўнічым вучылішчы. Быў інвалідам, нага ў калене не згіналася. Не ведаю, як так выйшла, але яму прапанавалі развіваць водныя віды спорту, у тым ліку і веславанне.

**Можна сказаць, што я першы акадэміст у краіне.** Першая лодка, у якую я сеў, была для акадэмічнага веславання. Нават стаў чэмпіёнам горада ў гэтай лодцы. Таму, мусіць, можна сказаць, што я першы акадэміст у нас у краіне. Потым з'явіліся звычайныя, нават не драўляныя, а фанерныя лодкі. Пазней Піліпенка прывёз чатыры каноэ. Яны былі зроблены ўжо не з фанеры, а з дошак. І былі вельмі цяжкія. Ён прывёз чатыры двухмесныя каноэ. Хоць у той час двухмесныя і аднамесныя лодкі былі аднолькавыя. І на гэтым каноэ-двойцы я нават здолеў выйграць чэмпіянат Беларусі.

**Хацелася плаваць не на рудавозе, а на каноэ.** Маці выхоўвала нас адна, і пытанне грошай стаяла вельмі востра. Мне было 17 гадоў, і мама ўладкавала мяне на работу. У Брэсце спыняліся рудавозы, якія развозілі руду па розных заводах. Праз знаёмага шкіпера маці ўладкавала мяне туды матросам. Вайна давала аб сабе знаць, мы недаядалі. Цэлы сезон я праплаваў на рудавозе, на добрым харчаванні, на свежым паветры папужнеў, падужэў. Якраз у гэты час Піліпенка прывёз у Брэст каноэ. Вяртаючыся з рэйса, я іх убачыў. І зразумеў, што хачу плаваць не на рудавозе, а на каноэ. Аж затросся ўвесь. Маці была, мякка скажам, здзіўленая, сын быў пры рабоце, а тут на табе, пра нейкае каноэ гаворыць. А я пабег на раку і адразу ж сеў у каноэ. У мяне быў добры навык — я ўмеў добра трымаць раўнавагу. А праз два месяцы ўжо выступаў на першынстве Беларусі. Мае сапернікі трэніраваліся значна даўжэй за мяне, але я ўсіх перамог. Думаю, дапамагло і тое, што я быў моцным, прывучаным да працы хлопцам.

**Шкада, што сёння не захаваўся такі фізкультурны рух, як у савецкі час.** Пасля вайны дзейнічала даваенная сістэма спорту. Заставаліся нарматывы ГПА (гатовы да працы і абароны), праграма «Варашылаўскі стралок», праводзіўся Дзень фізкультурніка. Тады Дзень фізкультурніка быў вялікім масавым святам, арганізоўваліся цікавыя забегі, спаборніцтвы, здача нарматываў. Спорт сапраўды быў масавым.

## КАЛІ СІЛЫ ПАКІДАЮЦЬ, РАТУЕ ТОЛЬКІ СІЛА ВОЛІ

Сяргей Макаранка і Леанід Гейштар селі ў каноэ за некалькі месяцаў да Спартакіяды народаў СССР 1959 года — і перамаглі на каронай дыстанцыі ў 10 000 метраў. У алімпійскім 1960 годзе дуэт Сяргея Макаранкі і Леаніда Гейштара стаў першым на Спартакіядзе народаў СССР на 10 кіламетрах. На алімпійскай дыстанцыі ў тысячу метраў яны саступілі 0,2 секунды асноўным прэтэндэнтам у алімпійскую каманду Паўлу Харыну і Хрысціяну Бацеву. Нягледзячы на другое месца, чамаданы ў алімпійскую сталіцу сказалі збіраць Макаранку і Гейштару. У Рыме ў беларускі дуэт верылі мала. Фаварытамі былі італьянцы, румыны, венгры. У Сяргея і Леаніда не было вопыту выступлення на буйных міжнародных спаборніцтвах, ды і разам яны выступалі нядоўга. Больш складаных умоў для перамогі, мабыць, прыдумаць складана. Але хіба гэтыя дзеці вайны баяліся складанасцяў? Мужчынскі заезд каноэ-двойкі на 1000 метраў Алімпійскіх гульняў у Рыме выйгралі — шліфавальшчык Гомельскага завода вымяральных прыбораў Леанід Гейштар і токар Брэсцкага завода «Газаапарат» Сяргей Макаранка.

**Уменне цярпець, не здавацца адрознівае моцных спартсменаў.** Мы з Лёнем хутка спрацаваліся. Ён спорт любіў, я спорт любіў. Мы абодва настырныя. Наша дыстанцыя за 10 кіламетраў вельмі цяжкая, не кожнаму дадзена яе прайсці. Калі сілы пакідаюць і хочацца спыніцца, ратуе толькі сіла волі. Вось у чым сутнасць гэтай дыстанцыі. За дыстанцыю 10 кіламетраў перад вачыма можа праляцець усё жыццё. Цяжка, вельмі. Але на спаборніцтвах ад цябе ўсе чакаюць выніку, і таму ты павінен усё вытрымаць.

**Падчас знаходжання ў савецкай зборнай мы ўвесь час былі пад прэсам розных цяжкасцяў.** Трапіць у зборную Савецкага Саюза было складана, а яшчэ складаней — там замацавацца. Трэба было прайсці сур'ёзную падрыхтоўку і выйграць кантрольныя спаборніцтвы. Трэнеры ў зборнай працавалі са сваімі вучнямі. І гэта было самае складанае. Бо кожны трэнер імкнецца прапхнуць свайго вучня наперад, усё роўна, моцны гэта спартсмен ці не. Нас уключылі ў зборную за год да Алімпійскіх гульняў. Маглі б да Алімпіяды выступіць і на чэмпіянаце Еўропы. Але за савецкім часам для таго, каб выехаць за мяжу, трэба было шмат часу для падрыхтоўкі дакументаў. Нам часу не хапіла. Так, у год, калі мы выйгралі Спартакіяду народаў СССР, чэмпіянат СССР, нас не ўзялі на чэмпіянат Еўропы з-за таго, што не паспелі падрыхтаваць дакументы. І толькі налета нас запрасілі на падрыхтоўку да Алімпійскіх гульняў. І тут новая складанасць. Мы спецыялізаваліся на 10 кіламетрах, а на Алімпіядзе была толькі дыстанцыя ў адну тысячу метраў. А для гэтай дыстанцыі трэба выконваць зусім іншую работу. Мы цэлы год прайгравалі і на дзесяці кіламетрах, і на тысячы. Шмат усялякіх праблем здаралася, якіх і не прадбачыш.

**Нават праз столькі гадоў я цудоўна памятаю наша выступленне на Алімпійскіх гульнях.** Падчас праходжання дыстанцыі напружанне было вар'яцкае. А ў нас быў яшчэ адзін фальстарт. Калі мы пайшлі на дыстанцыю, я нікога і нічога не бачыў, акрамя акваторыі. Я сядзеў ззаду і таму мог бакавым зрокам убачыць сапернікаў. Круціць галавой ні ў якім разе нельга, можа парушыцца раўнавага, а гэтага баяліся, як агню. Таму наколькі маглі, напружвалі бакавы зрок. У полі зроку нікога няма — значыць, ідзём наперадзе, працягваем цярпець і працаваць. Само разуменне, што гэта Алімпіяда — галоўныя спаборніцтвы — прымушала працаваць больш інтэнсіўна. Я не ведаю, дзе я яшчэ ў сваім жыцці выкладваўся так, як на Алімпійскіх гульнях. Цалкам аддаўся таму заезду. Памятаю, што мне дапамагалі вылезці з каноэ, сам я не мог.

**У нас былі нядрэнныя шанцы на перамогу на Алімпійскіх гульнях 1964 года.** Мы рыхтаваліся да Алімпійскіх гульняў 1964 года. Трэнера ў нас фактычна не было, працавалі самі і нядрэнна. Але Гейштар захварэў. Калі б гэтага не здарылася, мы б маглі перамагчы і ў Токіа. Шкада, вядома...

## ДЗЕ Б Я НІ ПРАЦАВАЎ, МНЕ НЕ БЫЛО ЦЯЖКА

Адказваць за сябе, будучы спартсменам, — гэта адно. Несці адказнасць за дзясяткі маладых рабят, будучы трэнерам — зусім іншае. Уладзімір Парфяновіч, Уладзімір Раманоўскі, Віктар Ранейскі, Мікалай Гарбачоў — алімпійскія чэмпіёны розных гадоў, якіх да вялікіх перамог прывёў Сяргей Лаўрэнцевіч Макаранка. А яго вучняў — чэмпіёнаў свету — наогул каля паўсотні.

**Чалавечыя рэсурсы не бясконцыя, і немагчыма ўвесь час вытрымліваць такое напружанне, пад якім былі мы.** Трэніравацца і рыхтавацца да Алімпіяды 1968 года мы ўжо не хацелі. У нас пачалі падаць вынікі. Мяне ў зборнай Савецкага Саюза пакінулі, а Гейштара — не. Я паспрабаваў выступаць з іншым напарнікам — Кузьміным, і мы сталі ўсіх перамагаць. Нават выйгралі адборачныя спаборніцтвы перад чэмпіянатам Еўропы. Але ў мяне не было дакументаў для выезду за мяжу. Я паехаў у Мінск, у Цэнтральны камітэт партыі, дамаўляцца наконт візы. Я быў упэўнены, што ў мяне ўсё атрымаецца: я ж алімпійскі чэмпіён, рыхтуюся паехаць на чэмпіянат Еўропы, дзе магу выйграць. Але быў жнівень і ўсе былі ў адпачынку. Сустрэў аднаго чыноўніка, ён мяне выслухаў і сказаў прыходзіць ранкам. Я прыходжу, а сакратар кажа, што той у дзевяць раніцы паляцеў у водпуск. Я пахадзіў па кабінетах, але мяне ўсюды адфутболілі. Усім было ўсё роўна на мой чэмпіянат Еўропы і магчымы медаль.

**Плаціць за тое, што ты алімпійскі чэмпіён, ніхто не збіраўся.** Галоўны трэнер зборнай Аляксандр Сілаеў прапанаваў перайсці на трэнерскую работу. Зарплата ў мяне была невялікая, таму што вынікі падалі. Так скончылася мая спартыўная кар'ера і пачалася трэнерская. Хлопцы, з якімі я трэніраваўся, сталі маімі вучнямі.

**Жонка прымусіла пагадзіцца на работу ў Германіі.** Аднойчы з юнацкай камандай я паехаў у Германію, і мяне запрасілі туды на работу. Мая Ала Барысаўна паставіла ўльтыматум: або я згаджаюся, або развод. Мы вельмі мала часу праводзілі разам, а тут з'явілася такая магчымасць. І мы паехалі. У Германіі я нават вырасціў аднаго чэмпіёна свету, атрымаў цікавы вопыт.

**Мы першыя пачалі зімовую падрыхтоўку.** Я вярнуўся дадому на пасаду галоўнага трэнера зборнай Беларусі. Працаваў з рэзервам, адкрываў веславанне ў новых беларускіх гарадах. Мы першыя ў СССР пачалі праводзіць зімовую падрыхтоўку. Там, дзе працуюць электрастанцыі, вадаёмы не замярзаюць круглы год. Таму мы ездзілі трэніравацца ў Новалукомль, Белаазёрск, Светлагорск. Вада там заўсёды цёплая, калі перавернешся — нястрашна.

**Нічога не рабіць аказалася складана.** А потым прыйшло запрашэнне ў Індыю. Ала Барысаўна сказала, што краіна цікавая. Так я аказаўся ў Індыі. І там усё ў мяне пайшло добра, я практычна адрадзіў там веславанне. А потым год у Кітаі, але адтуль я з'ехаў: з-за няпростага клімату пачалася стэнакардыя. Пасля быў Іран, і там усё ішло нядрэнна. Але я з'ехаў з-за Рамадана, бо цэлы месяц нічога не рабіць для мяне аказалася вельмі складана.

**Дзе б я ні працаваў, мне не было цяжка.** Бо я заўсёды стараўся добрасумленна выконваць сваю работу. Нават нягледзячы на тое, што я алімпійскі чэмпіён, я заўсёды быў патрабавальным да сябе. Я не самалюбівы чалавек і я не надаю вялікага значэння таму, што я алімпійскі чэмпіён. Я гэтым не карыстаюся, часам нават не хачу лішні раз казаць. Усе мае званні — гэта толькі пацвярджэнне маёй работы. Але для мяне гэта не самае галоўнае ў жыцці.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 71 (597)

Напярэдадні

# НЕАБХОДНАСЦЬ ХАДЗІЦЬ У ТЭАТР,
## альбо 90-ы сезон у традыцыях Вялікага

**У юбілейны сезон Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы і балета Беларусі мае намер ушанаваць асоб, якія мелі дачыненне да яго станаўлення і працуюць у ім сёння, а таксама прадставіць прэм'еры і найлепшыя спектаклі. Дарэчы, не толькі ў Мінску, бо ёсць і гастрольныя планы. У прыватнасці, балетная трупа запрошана на фестываль у Каралеўства Тайланд, а ў канцы кастрычніка нашы спектаклі — оперу У. Солтана «Дзікае паляванне караля Стаха» ў пастаноўцы Г. Маторнай і балет П. Чайкоўскага «Шчаўкунок» у харэаграфіі В. Елізар'ева — можна ўбачыць у афішы Вялікага тэатра Расіі. Але галоўная ўвага — да айчыннага гледача.**

Яго чакаюць чатыры прэм'еры на вялікай сцэне ў сезоне. Ужо ў канцы верасня адбудзецца прэм'ера балета А. Адана **«Жызель»** у пастаноўцы Ігара Колба, які збіраецца максімальна задзейнічаць тэхнічныя магчымасці сцэны. А публіка спадзяецца, што і магчымасці трупы, якая да пачатку сезона абнавілася на 25 працэнтаў. На работу паступілі 29 чалавек, сярод якіх выпускнікі Акадэміі Рускага балета імя А. Ваганавай у Санкт-Пецярбургу, Акадэміі танца Барыса Эйфмана, а таксама маладыя артысты з Масквы. З Мінскага харэаграфічнага каледжа прыйшлі 9 чалавек. «Лічу, што гэта значная падзея ў жыцці тэатра, — кажа **галоўны балетмайстар тэатра Ігар КОЛБ**. — Да нас прыйшлі адукаваныя людзі, мяркую, што яны паўплываюць на настрой і ўнутраны складнік таго, што мы маем на сённяшні дзень».

У сезоне адбудзецца яшчэ адна прэм'ера балета: працаваць над увасабленнем **«Дон Кіхота»** будзе мастацкі кіраўнік Вялікага тэатра Валянцін Елізар'еў, які ўжо звяртаўся да твора Л. Мінкуса. Гэта вечная класіка: балет вельмі любіць і публіка, і трупа. Мы ўбачым згаданую гісторыю ў сакавіку ў новым мастацкім прачытанні. Сёлета Валянцін Елізар'еў адзначае асабісты юбілей, у яго гонар 30 кастрычніка тэатр рыхтуе гала-канцэрт, у якім возьмуць удзел зоркі сусветнага і беларускага балета, якія да гэтага часу павінны вярнуцца з гастроляў, што запланаваныя на кастрычнік.

А пакуль частка трупы будзе на гастролях, тэатр збіраецца прыцягваць аматараў адмысловымі праектамі. Такімі, як канцэртна-сцэнічнае выкананне оперы **«Набука»** Дж. Вердзі. Спектакль сышоў з афішы, але музыка, выканаўцы і хор засталіся. Народная артыстка Беларусі і галоўны хормайстар тэатра Ніна Ламановіч лічыць, што гэта той падыход, які дазваляе больш проста задавальняць жаданне гледача далучыцца да館 опернай музыкі, нездарма да яго звяртаюцца ўсе тэатры свету. Але не менш прывабнымі будуць падчас гастроляў тэатра канцэрты: «Музыка Галівуда. Джон Уільямс» і «Вяртанне легенды. Канцэрт ансамбля скрыпачоў Вялікага тэатра Расіі».

Адметна, што оперная трупа мае намер раўняцца на балет у стварэнні папулярных, «глядацкіх» спектакляў, а таксама дбае пра тое, каб выхоўваць публіку для разумення гэтага віду мастацтва. І ўжо да Каляд галоўны рэжысёр тэатра збіраецца прадставіць дзіцячую оперу С. Баневіча **«Гісторыя пра Кая і Герду, альбо Снежная каралева»**. «На мой погляд, адзін з ключавых кірункаў, якім павінен займацца Вялікі тэатр, — дзіцячы рэпертуар, — адзначае **Ганна МАТОРНАЯ**. — У юбілейным сезоне вялікае значэнне мы будзем надаваць таму, каб адрадзіць, распрацаваць вучэбныя праграмы для дзяцей, каб яны прыйшлі ў тэатр. Мы хочам, каб юбілейны сезон стаў ключавым у адліку вяртання любові да гэтага цудоўнага жанру, каб людзі лічылі неабходным хадзіць у тэатр, каб ён стаў часткай іх жыцця».

Оперныя страсці, але ў лёгкім варыянце, актывізуюцца вясной, калі на сцэну Вялікага тэатра Беларусі вернецца твор Д. Расіні **«Севільскі цырульнік»** — сапраўды, вечная класіка, над увасабленнем якой будзе працаваць італьянская пастановачная група.

Новыя спектаклі оперы і балета, якія былі б створаныя на музыку айчынных кампазітараў, многія прыхільнікі тэатра з задавальненнем пагледзелі б у юбілейным сезоне, але прыйдзецца пачакаць: творы пішуцца, але тэхнічна могуць быць рэалізаваныя на сцэне праз некалькі гадоў. Якія гэта павінны быць творы? **Генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Кацярына ДУЛАВА** растлумачыла: «А цяпер мы ідзём па тым рэпертуары, які нам бачыцца дарэчным, — ён святочны, можа падавацца нават лёгкім».

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Каб помнілі...

# УРОКІ ЛЕАНІДА РАХЛЕНКІ



**6 верасня споўнілася 115 гадоў з дня нараджэння народнага артыста СССР і БССР, выдатнага акцёра, рэжысёра, педагога Леаніда Рахленкі.**

Нават у сталым узросце, калі ён ішоў па вуліцы, мінакі абарочваліся ўслед. І не толькі тыя, хто пазнаваў Гарлахвацкага з «Хто смяецца апошнім», але і звычайныя людзі. Усё ў Леанідзе Рахленку — постаць, выразны твар, праніклівы іранічны погляд — звяртала на сябе ўвагу, прыцягвала нібы магнітам.

«Ого, колькі атлетаў і пераможцаў зляпілі з мяне ў маладосці...», — усміхаўся ён, успамінаючы, як у юнацтве падзарабляў натуршчыкам у скульптурных майстэрнях. І невыпадкова яго запрашалі на ролі прафесараў (у фільмах «Вясновыя навальніцы», «Расклад на паслязаўтра») — Леанід Рахленка быў інтэлектуальным, адукаваным чалавекам.

### УЛАДА СЦЭНЫ

Леанід Рыгоравіч (Эвель (Ляўон) Гдалевіч) Рахленка нарадзіўся ў станіцы Церахоўка Гомельскай вобласці. У 17 гадоў паступіў у Ленінградскі тэхнікум сцэнічных мастацтваў. У 1929 годзе прыйшоў у Беларускі дзяржаўны тэатр і больш за паўстагоддзя (да 1981 года) служыў яго гледачу. У найскладанейшыя 1938—1943 гады загадваў мастацкай часткай калектыву. Падчас вайны, калі трупу эвакуіравалі ў Томск, ставіў спектаклі: «Крылатае племя», «Фронт», «Рускія людзі». У складзе франтавой брыгады разам з калегамі Верай Пола, Паўлам Пекурам, Барысам Ямпольскім, Здзіславам Стомам, Маргарытай Шашалевіч, Раісай Кашэльнікавай выступаў перад байцамі. У 1956—1958 і 1967—1969 гадах быў мастацкім кіраўніком студыі пры тэатры, рыхтаваў акцёрскую змену.

— Падчас нашых гутарак ён не раз згадваў, як далучаліся да супрацоўніцтва з тэатрам ужо прызнаныя беларускія празаікі і паэты, якія да жанру драматургіі адносіліся датуль асцярожна, — Кузьма Чорны, Змітрок Бядуля, Кандрат Крапіва, — чытаем ва ўспамінах журналіста Уладзіміра Няхамкіна. — І я думаю кожны раз, што далучэнне тое адбывалася ў немалой ступені дзякуючы яму, Рахленку. Тады, у першыя дзесяцігоддзі жыцця тэатра, на ўсталяванне кантакту з літаратарам, у якім тэатр адчуваў свайго патэнцыяльнага аўтара, калегі часцей за іншых адпраўлялі менавіта яго.

Разумелі: інтэлект, подых унутранай сілы ды сама імпазантнасць аблічча гэтага чалавека будуць садзейнічаць узнікненню ў пісьменніка даверу да працягнутай тэатрам рукі дружбы.

Леанід Рахленка стаў першым рэжысёрам, які ўвасобіў на беларускай сцэне п'есы Кандрата Крапівы і Аляксандра Астроўскага. Усяго ён паставіў некалькі дзясяткаў спектакляў. Сярод іх «Салавей» Бядулі, «Партызаны» Крапівы, «Без віны вінаватыя» Астроўскага, «Вогненны мост» Рамашова, «Крамлёўскія куранты» Пагодзіна, «Скупы» Мальера.

Многія крытыкі адзначалі: калі б Рахленка паставіў толькі «Хто смяецца апошнім», то аднаго гэтага было б дастаткова, каб пакінуць след у тэатральным мастацтве Беларусі. У 1939 годзе патрабавалася немалая смеласць, каб брацца за такую драматургію. Для гэтага спектакля рэжысёр сабраў зорны склад. Лідзія Ржэцкая выконвала ролю цёткі Каці, Глеб Глебаў — Тулягі, Барыс Платонаў — Зёлкіна, Стэфанія Станюта — Зіначкі Зёлкінай, сам Леанід Рахленка — Гарлахвацкага. Гэты спектакль меў трыумфальны поспех. Ён стаў сапраўдным шэдэўрам і пратрымаўся на купалаўскай сцэне 30 гадоў.

— Я ведала тэкст п'есы на памяць, прыбягала на кожны спектакль, — прызнавалася ў адным інтэрв'ю Валянціна Рахленка. — Тата адчуваў сябе настолькі вольна ў гэтым спектаклі, што дазваляў сабе жартаваць, калі ведаў, што я сяджу ў зале. Была сцэна, калі Гарлахвацкі перабірае лісты і называе адрасатаў, і сярод іх... Валянціну Леанідаўну Рахленку. Захапленню майму не было мяжы!

Рахленка выконваў ролю Гарлахвацкага 400 разоў, і заўсёды выклікаў у публікі буру захаплення. Многія лічылі гэтую ролю самай бліскучай у яго біяграфіі. Але і іншыя персанажы ў яго выкананні станавіліся настолькі пераканаўчымі, жывымі, што іх пачыналі атаясамліваць з акцёрам. Казалі, што ён вельмі рацыянальны. Але гэта быў рацыяналізм майстра, які да драбнюткіх дробязяў уяўляў, як павінен рухацца,



Леанід Рахленка з жонкай Лідзіяй Ржэцкай.

размаўляць, паводзіць сябе яго герой. Ён матэматычна вывяраў вобраз. Расказвалі, што ў спектаклі «Апошняя ахвяра», калі Леанід Рахленка ў ролі Флора Прыбыткава ў адказ на пацалунак Юліі Паўлаўны (яе выконвала Лілія Давідовіч) прамаўляў словы: «Гэты пацалунак дарагога варты» (а гледачы следам падносілі да вачэй насоўкі), ён мог павярнуцца да залы спінай і паказаць язык калегам за кулісамі.

### ЖЫЦЦЁ ПА-ЗА СЦЭНАЙ

З Лідзіяй Ржэцкай Леанід Рахленка пазнаёміўся ў тэатры. Лідзія Іванаўна была ўжо прымай і ўдавой, а ён — акцёрам-пачаткоўцам, на восем гадоў за яе маладзейшым. Вядома, шмат хто спачатку ўспрымаў іх шлюб як мезальянс. Але той шлюб насамрэч аказаўся моцным і гарманічным. Па ўспамінах блізкіх, Лідзія Іванаўна адразу ж безумоўна прызнала прафесійнае і інтэлектуальнае лідарства свайго спадарожніка жыцця.

Леанід Рыгоравіч з вялікай павагай ставіўся да жонкі, разумеў яе акцёрскі маштаб, як рэжысёр і клапатлівы муж, дапамагаў рэалізаваць яе талент. Дачцэ Ржэцкай ад першага шлюбу Таццяне Аляксеевай Леанід Рыгоравіч замяніў бацьку, не робячы ніякай розніцы паміж стаўленнем да яе і да роднай Валянціны.

— Бацькі вельмі берaглі згоду ў сям'і, — адзначала Валянціна Рахленка ў інтэрв'ю журналістцы Тамары Абакумаўскай. — Можа, у іх і ўзнікалі канфлікты, але я ніколі не чула сварак, лаянак, скандалаў. Мяккая і падатлівая ў быце, мама была вельмі моцным чалавекам, калі трэба было чагосьці дабіцца ў начальства для тэатра. Нездарма бацька называў яе «цяжкай артылерыяй». Бацькі былі працаўнікамі, вельмі адказнымі людзьмі. Але я ніколі не чула ад іх: вучыся, вучыся, вучыся. Мама, па-мойму, не ведала, як адчыняюцца дзверы ў школе, а тата часам блытаў, у якім я класе.

У сям'і прытрымліваліся пэўнага рэжыму. З раніцы Лідзія Іванаўна і Леанід Рыгоравіч ішлі на рэпетыцыі, перад спектаклем абавязкова адпачывалі. Ніякага багемнага духу, ніякіх застолляў да раніцы. Але святы ў сям'і любілі.

— З нагоды свят уся вялікая сям'я збіралася разам, прыходзілі сябры дзядулі, бабулі, бацькоў, — успамінае ўнучка народных артыстаў Наталля Балоціна, дачка Валянціны Рахленкі. — За сталом расказвалі анекдоты, жартавалі, абмяркоўвалі навіны тэатральнага жыцця. Потым танцавалі. За раялем была мама і мой дзядзька — кампазітар Генрых Вагнер. Мая цётка Таццяна Аляксеева прыдумвала цікавыя шарады. На новы год бацькі рабілі насценгазету з шаржамі і эпіграмамі на кожнага прысутнага. У нашым доме заўсёды вельмі смачна гатавалі. Бабуля дзівосна марынавала селядзец; мама пякла заварныя пірожныя. Калі на стале з'яўлялася качка з яблыкамі і чарнаслівам, дзядуля звычайна прасіў: «Пакіньце, калі ласка, мяне з ёй сам-насам». Гасцям, якія сядзелі паміж маім бацькам (урачом-хірургам Генадзем Гейнэ. — **Заўв. аўтара**) і дзядзькам (Генрыхам Вагнерам — **Заўв. аўтара**), дзядуля казаў: «Запомніце гэты выключны момант — вы сядзіце паміж Гейнэ і Вагнерам!»

Лідзія Ржэцкая была добрай, але пры гэтым строгай, нешматслоўнай, вельмі правільнай. Яна іграла толькі на сцэне, а дома станавілася звычайнай жанчынай. А вось для Леаніда Рыгоравіча і ў жыцці заўсёды знаходзілася месца для ігры і тэатральнасці. Вядома, ён бываў часам нецярпімым, з'едлівым, уладным, катэгарычным. Але ўсё гэта кампенсавалася маштабам яго асобы, талентам, абаяльнасцю, як сказалі б цяпер, — харызмай.

Па ўспамінах блізкіх, Леанід Рахленка быў вельмі сціплым у быце. Калі патрабаваліся шорты, браў старыя штаны і абразаў да патрэбнай даўжыні. Зношвалася крысо плашча — прасіў у тэатральным касцюмерным цэху яго падкараціць і працягваў насіць. З галаўных убораў аддаваў перавагу чорным берэтам.

Калі ў Наталлі Балоцінай нарадзілася дачка, Леанід Рахленка прыходзіў наведваць унучку пад вокны радзільнага дома, і яна часта чула ад суседак па палаце: «Наташа, які прыгожы ў цябе бацька!»

Чалавек вельмі самадастатковы, Леанід Рыгоравіч вылучаўся выбіральнасцю ў сяброўстве. Ён мала з кім дзяліўся сваімі душэўнымі перажываннямі ў апошнія гады. Відаць, яму было нялёгка ў гэты час, ён пакутаваў без тэатра, без работы, без гледача.

— Так супала, што я з ім у адзін час знаходзіўся ў адной бальніцы, нават у адным аддзяленні, — успамінаў Уладзімір Няхамкін. — Да мяне наведваўся кінарэжысёр, сааўтар па дакументальнай стужцы, якая ў нас запускалася ў вытворчасць. І калі я адказаў на пытанне Леаніда Рыгоравіча, што гэта за чалавек мяне наведвае, то пачуў сумнае: «Вы працуеце... Працуеце...»

Сыход з жыцця Лідзіі Іванаўны Ржэцкай у 1977 годзе вельмі падкасіў Леаніда Рахленку. Без дарагой жонкі, без сцэны ён, напэўна, усё часцей адчуваў нуду, адзіноту. Леанід Рыгоравіч перажыў сваю спадарожніцу на восем гадоў. Як і Лідзія Іванаўна, памёр ва ўзросце 79 гадоў. Пахаваныя яны на Усходніх могілках...

Калісьці 16-гадовым юнаком ён пайшоў з дому, бо хацеў стаць акцёрам. І пасля 55 гадоў на Купалаўскай сцэне Леанід Рахленка па-ранейшаму верыў у высокае прызначэнне тэатра. У тое, што тэатр духоўна ўзбагачае, падзяляе з гледачом боль, дорыць хоць крыху святла і радасці, дазваляе перажыць цяжкія часы.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**
**Фота дадзена Галінай ВАГНЕР.**
*(Больш фота на сайце «Звязды».)*

Нясумнае чытанне

# «СЕМ ГРОЗНЫХ КОЛАЎ У МЛЫНЕ»

## Самыя адметныя паэтычныя партрэты Мінска

**На пачатку верасня Мінск святкуе дзень нараджэння. У гэтым годзе свята асаблівае — 955 гадоў... Зразумела, з часоў першай згадкі ў летапісе горад на берагах Нямігі і Свіслачы неаднойчы трапляў на старонкі, спісаныя мемуарыстамі, пісьменнікамі і паэтамі. А кожны паэт ствараў уласны вобразны партрэт нашага любімага горада... Давайце ўспомнім самыя адметныя з тых партрэтаў.**

### «Прыгожы, відны, кругом весяленькі»

Мусіць, самы запамінальны паэтычны партрэт Мінска мінулых стагоддзяў стварыў стары мінчук **Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч**. Як пісаў Рамуальд Зямкевіч у сваіх нататках пра Мінск, «Прайшоўшы колькі сажняў ад былўшае рагаткі-заставы ўперад, мы апынімся каля дома, які ў сучасны момант належыць да пана Бржазіцкага. У гэтым самым месцы, дзе цяпер ідзе дзеравянны паркан, радам з варотамі дома Бржазіцкага стаяў невялічкі домік беларускага паэта Вінцука Дуніна-Марцінкевіча, прайграны праз яго, як кажуць старыя людзі, у карты нейкаму пану Пацейку, каторы пасля гэты домік разабраў і збудаваў на яго месцы радам два дамы, якія належаць цяпер да Бржазіцкага і Шыманскага».

Цікавыя размовы вяліся ў тым дамку, калі гаспадарыў паэт! Збіраліся інтэлектуалы, патрыёты, мройнікі... Гаспадар любіў цікавыя гісторыі, байкі, анекдоты. І ў сваіх творах часта згадваў байкі пра Мінск. Пра Серабранскую карчму, дзе пакідаеш апошні грош, пра Лошыцу і ейных стыхійных духаў, пра Ніжні рынак і трох мінскіх жартаўнікоў, якія ледзь з розуму не звялі мужычка, што прадаваў пеўня — адзін за адным запэўнівалі яго, што ў яго руках заяц...

У паэме «Вечарніцы» дзед Зміцер так апісвае горад:

*Няма як Мінск наш! — дзетачкі міленькі!*
*Прыгожы, відны, кругом весяленькі;*
*Ні адной мізэрнай не сустрэнеш хаты,*
*Вот, маўляў снег белы, каменны палаты;*
*Пасярэдзіне ўецца круглай стружкай*
*Свіслач-рака — зялёнай устужкай;*
*Вот не урокам — горад хоць куды!*
*І цару тут не было б нуды!*
*А людзі, людзі! — дзеткі дарагія!*
*Не заморскія! Маўляў, не чужыя!*
*А ўсё свае — веры хрысціянскай,*
*Шчодры, дабры, натуры не панскай.*

### «Празвініць на вуліцах трамвай...»

Сапраўдным цудам для мінчан стаў пуск трамвая. Здарылася гэта 13 кастрычніка 1929 года. На ўсім шляху новага транспарту, ад вакзала па вуліцы Савецкай, стаялі людзі, кідалі ў вокны вагона кветкі. Цэлы дзень трамвай вазіў усіх бясплатна. А малады паэт **Паўлюк Трус** прысвяціў падзеі паэму «Дзясяты падмурак», тую самую, дзе ёсць вядомыя песенныя радкі «Падаюць сняжынкі, дыяментырос».

*Творчы міг... Напорная імклівасць...*
*Працай тут заняты муляры.*
*І пад небам зорнасці маўклівай*
*Вырастаюць волаты-муры.*
*— Добры дзень, аснежныя прасторы,*
*Добры дзень, сталіца хараства!*
*Скора ў бляску вечара, ой, скора*
*Празвініць на вуліцах трамвай.*

Нягледзячы на маладосць, Паўлюк Трус быў дужа папулярны — на яго вечарыны набівалася народу, дзяўчаты букетамі задорвалі... Памёр у дваццаць пяць ад тыфу на чыгуначным вакзале ў Мінску, калі вяртаўся з творчай камандзіроўкі як селькар... Яго магіла — на Вайсковых могілках, паўз якія і сёння ходзіць успеты паэтам трамвай.

### «Над Мінскам меркнуць зоры»

14 кастрычніка 1928 года паэт-маладняковец **Янка Бобрык**, студэнт БДУ, напісаў паэтычную імпрэсію пра Мінск... Не ведаючы, што суджана яму памерці далёка, у Ленінградзе. У 1931 годзе Бобрык паступіў у аспірантуру Ленінградскай дзяржаўнай акадэміі мастацтвазнаўства, потым працаваў на студыі Белдзяржкіно, якая тады знаходзілася ў Ленінградзе. Па стане здароўя яго знялі з ваеннага ўліку, але ў жніўні 1941 года паэт зрабіўся добраахвотнікам народнага апалчэння. Яму некалькі разоў прапаноўвалі эвакуіравацца ў тыл, ён адмовіўся і трываў усе жахі блакады. У канцы ліпеня 1942 года Бобрыка падабралі непрытомнага на вуліцы, адвезлі ў бальніцу. Ён пахаваны на Піскароўскіх могілках. А ягоны верш «Ноч над Мінскам» варты згадкі:

*...А ноч харошая такая...*
*А ноч — і ціш наўкол.*
*Чуць чутна ліст з бярозы ападае,*
*то слёзы лета капаюць на дол...*
*А ноч харошая такая,*
*а ноч — не спіцца мне.*
*Над Мінскам меркнуць зоры, дагараюць,*
*як у маёй далёкай старане.*
*А ноч харошая такая,*
*а ноч — азёрнай сіні гладзь.*
*Там дзесьці лес ў таемнасці змаўкае,*
*тут камяніцы хмурасцю глядзяць.*
*А ноч харошая такая,*
*а ноч — краса мая!*
*Паволі бурны горад заціхае,*
*а з ім і я.*

### «Сталі там хаты малыя, маркотныя»

**Пятрусь Броўка** не адразу стаў забранзавелым класікам... Быў час, ён выглядаў даволі задзірыста, быў ініцыятарам «Ліста 15-ці» супраць вульгарызатарскай крытыкі, сябраваў з Янкам Купалам — яго нават называлі «прыдворным паэтам Купалы» ці ягоным ад'ютантам. Ёсць у Броўкі цэлая паэма пра Мінск, у якой аўтар апісвае непаглядн мінулае горада і ягоныя цудоўныя змены пры савецкай уладзе... А мы давайце ўспомнім верш «Прыгожая вуліца», прысвечаны канкрэтнай вуліцы, якая палюбілася яму, калі вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта БДУ.

*Мясціна такая ніяк не забудзецца,*
*Пазнаеш, —*
*Здаецца, навекі твая.*
*Ёсць ціхая ў Мінску Прыгожая вуліца,*
*Забыцца якое не здолею я.*
*Сталі там хаты малыя, маркотныя,*
*Зялёнымі хусткамі*
*Хутаў іх мох.*
*Чаму яе звалі назвай пяшчотнаю,*
*Ніяк зразумець я ў юнацтве не мог.*
*Небрукаваная і непралазная,*
*Дзе цемра, бывала,*
*Да ранку стаіць...*
*А смутак па ёй адчуваю выразна я,*
*І сэрца нявызнаным болем шчыміць.*
*Вясною садамі цвіценне мятлюжнае,*
*Дзяўчаты ў сукенках*
*Бялюткіх як снег.*
*Жылі мы сям'ёю студэнцкаю, дружнаю,*
*Не чэзнуў ніколі на вуліцах смех...*
*Спатканні былі ў нас, што часу не бачылі,*
*Прыходзілі*
*Часта дамоў па расе.*
*Кляліся ў каханні мы слоўмі гарачымі,*
*Хоць слова стрымалі далёка не ўсе.*
*А час той, куды ён, навошта спяшаецца?*
*Гады прамільгнулі,*
*Як хваля адна.*
*Усё, як той кажа, ідзе і змяняецца,*
*І сёння я вуліцы той не пазнаў.*
*І, можа, таму, што старыя, сівыя мы,*
*Што зніклі*
*Навокал малыя дамы,*
*Здаецца, што моладзь*
*Яшчэ больш імклівая*
*Ідзе па Прыгожай, як некалі мы.*



Мінск. Нова-Маскоўская вуліца.

### «Толькі мне не спіцца нечага...»

Малады паэт **Аркадзь Гейнэ**, родам з Бешанковіч, вучыўся ў Мінску, у інстытуце журналістыкі, паспеў папрацаваць у рэдакцыях... Калі пачалася вайна, адправіўся на фронт. Малодшы лейтэнант Гейнэ камандаваў узводам 66-й механізаванай брыгады. Ён загінуў у баі пад Сталінградам 16 снежня 1942 года ў 23 гады. Паглядзіце, як у сваім вершы «Мара» колішні натхнёны студэнт спалучае беларускі горад і касмічныя мары:

*Позні час. Пустынныя вуліцы.*
*Горад спіць. На дахах дамоў*
*Ночы шэрань нямая туліцца,*
*Навяваючы тэмы сноў.*
*Толькі мне не спіцца нечага,*
*Не знаходжу спакою ў сне.*
*Зоркі бліскаюць Шляху Млечнага*
*І таемнасцю вабяць мяне.*
*Я на іх пагляджаю і думаю:*
*Вось у гэты ж самы час*
*Марсіянін з такою ж думаю*
*Пазірае, быць можа, на нас...*
*Раптам дзесьці ў цішы напружанай*
*Праімчаўся і хутка знік,*
*Прагрымеўшы па рэйках узбуджана,*
*Прагучэўшы гудком, цягнік...*
*Я падумаў: гады пракоцяцца,*
*І па Млечнаму Шляху тады*
*Будуць також звычайна праносіцца*
*Міжпланетныя паязды.*
*І маёй затаённай мараю —*
*Гэта жыць у той слаўны дзень,*
*Каб сусветным экспрэсам над хмараю*
*Узляцець к таямнічай звяздзе.*

### Руіны і агонь

Як выглядаў Мінск на пачатку вайны, пад бамбёжкамі, у трывожным святле пажараў, занатаваў **Аркадзь Куляшоў** у паэме «Сцяг брыгады», апісаўшы ўласныя ўражанні.

*«Чым сустрэла мяне мая вуліца,*
*Як я выходзіў?*
*Мы жылі з ёй у згодзе,*
*былі з ёй амаль што сябрамі,*
*Шырыню, даўжыню яе ўласныя*
*змерыў нагамі.*
*Крокі ўчуўшы мае, адгукалася рэхам*
*знаёма,*
*Запрашаючы ў восьмы пад'езд*
*камунальнага дома...*
*Не кватэр аганькі*
*Мірна ў вокнах гараць, як калісьці,*
*А агню языкі*
*Ліжуць ліпы салодкае лісце.*
*І пазнаць я не мог*
*Роднай вуліцы, ліп і каштанаў;*
*Рэха тысячы ног*
*Аглушыла мяне нечакана,*
*Падхапіла мяне, маё гора,*
*Жаданні, трывогі*
*І панесла за горад*
*Па бітаму шклу мае ногі...*

Называе аўтар і вуліцу, якой прысвячае гэтыя радкі:

*«Ад імя жыхароў,*
*Наша вуліца Нова-Маскоўская,*
*Гавару, што з усімі пайшоў*
*У Чырвонае войска я».*

Удакладню, што Нова-Маскоўская вуліца сёння называецца Мяснікова, яна знаходзіцца непадалёк ад вакзала.

### «Стары твой сад пасекла»

А каб убачыць пасляваенны Мінск, які аднавіўся, але захоўвае памяць пра былую трагедыю, давайце пачытаем верш яшчэ аднаго паэта-франтавіка, **Пімена Панчанкі**, напісаны ў 1976-м:

*Зялёны Мінск, стары твой сад пасекла*
*Вайна, але ў адным двары сустрэў*
*Я выхадцаў з распаленага пекла —*
*Старыя купы даваенных дрэў.*

*Яны жывуць, і шалясцяць, і свецяць,*
*Іх цёмная кара ўсмактала горкі дым.*
*І хочуць расказаць яны*
*пра нешта дзецям,*
*Але не зразумець іх боль малым.*

*Іду штодня пад вадаспады лісця*
*Птушыную паслухаць талаку;*
*Ды абыходжу дрэва, што калісьці*
*Падпольшчыка хістала на суку.*

### «Над Свіслаччу грукоча млын»

У кожнага паэта былі і ёсць свае ўлюбёныя мястэчкі Мінска, дзе добра думаецца, дзе можна набрацца ўражанняў. (Паэт Міхась Стральцоў, напрыклад, прыходзіў на магілу Паўлюка Труса на Вайсковых могілках.) Усё часцей трапляюць у мастацкія творы легенды і паданні горада... Рыгор Барадулін апаэтызаваў легенду пра казачнага млынара ў «Каменнай баладзе», узяўшы эпіграфам старую прыказку «Не пайду я да Менска ад шляху Віленска; а пайду па шляху Віленскім, спаткаюся з Менескам».

*Сcівеў маркоты сын-пальын*
*На ўсіх шляхах расстайных.*
*Над Свіслаччу грукоча млын,*
*Аж берагі хістае.*

*Сем грозных колаў у млыне*
*(Хоць трохі сцішыў гул бы),*
*Каменняў поле заглыне —*
*Намеле пытлю гурбы...*

*...Млынар — асілак і вядзьмар,*
*Дыхне — шумяць прысады.*
*Ён ліўні і грымоты з хмар*
*Маланкай выкрасае.*

*Разлогі цемра захлыне,*
*Цішэе над барамі —*
*Мянеск імчыцца на млыне,*
*Дружыну набірае.*

Няхай жа кожны з вас знойдзе свой літаратурны Мінск у дні яго юбілею, а паэты натхняцца на новыя вершы пра свой горад!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 23 сентября 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 60 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5, 7, 18–20, 22, 25, 26, 28, 29, 35, 46, 48, 49, 50) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2021 г. № 184 (29553).**

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5; 8–22; 24–28; 30–35; 41–50, 53) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.01.2022 г. № 15 (29637)**

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.**

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»): BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X**, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) – ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893. К/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 10 сентября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 сентября 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона, полный список имущества с ценами и размером задатка по лотам размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.**

---

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: ОАО «СДСК» (УНП 400024628), 247439, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 10, в лице антикризисного управляющего ООО «Правовая стратегия», тел. + 375 (17) 396-61-34.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **27 сентября 2022 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

**Предмет торгов – 2/5 доли (1593,5 кв. м) в имущественном праве на объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 342/С-12380, общ. пл. 3966,8 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное,**

**Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Свердлова, 9, на земельном участке с кадастровым № 325050100001004451.**

Начальная цена предмета торгов – 307 440,00 бел. руб. с НДС.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 12.09.2022 г. с 09.00 по 26.09.2022 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 14.07.2022 г.

---

**Центр Промышленной Оценки**

• **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
• **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «АГАТ – системы управления» – управляющая компания холдинга «Геоинформационные системы управления», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 117, пом. 1** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронного аукциона: имущество, реализуемое одним лотом, в составе**

| Наименование | Адрес |
|---|---|
| **Административно-бытовой корпус** (здание административно-хозяйственное) общей площадью 781,1 кв. м, инв. номер 500/С-36143 (инв. номер по бухучету 55) **Составные части и принадлежности:** 1. Навес с бетонной площадкой (навес (литер 2) инв. номер по бух. учету 70; 2. Ограждение железобетонное пл. Поляна – 3 (ограждение литер г; ограждение литер д, калитка, ворота литер ж, ворота литер е), инв. номер по бух. учету 122; 3. Внутриплощадочные дороги (П-3) (площадка литер а; площадка литер б; площадка литер в), инв. номер по бух. учету 118; 4. Сети канализации (П3) (канализационный выпуск литер ж), инв. номер по бух. учету 161 | г. Минск, ул. Карвата, 94/12 |
| **Здание склада Литер Б 1/М** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) общей площадью 952 кв. м, инв. номер 500/С-32882 (инв. номер по бух. учету 68) | г. Минск, ул. Карвата, 94/13 |
| **В состав лота входит следующее имущество:** электрощитовая (инв. номер по бух. учету 159); система пожарной сигнализации (инв. номер по бух. учету 50372); хозяйственно-питьевая водопроводная сеть (инв. номер по бух. учету 160); многолетние зеленые насаждения (деревья – 63 шт) (инв. номер по бух. учету 90914); кустарники (кол-во 12 шт.) (инв. номер по бух. учету 90967); газон (инв. номер по бух. учету 90970) | г. Минск, ул. Карвата, 94 |

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 1,6848 га для обслуживания здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ и здания административно-хозяйственного

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **909 464,18 белорусского рубля (снижение на 30 %)** |

**Более подробная информация о предмете электронных торгов размещена на электронной площадке ИПМ-Торги www.ipmtorgi.by, и на сайте организатора аукциона www.cpo.by**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки».** УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи**

Договор купли-продажи Покупатель обязан подписать в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Договор купли-продажи недвижимого имущества подлежит государственной регистрации в срок, указанный в договоре купли-продажи, за счет покупателя. Продавец составляет и направляет договор купли-продажи для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,8 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 28.07.2022 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**

Начало торгов: **10.00 22.09.2022 г.**

Окончание торгов: **11.00 22.09.2022 г.**

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **20.09.2022 г. до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

---

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## о проведении **27 сентября 2022** года повторных торгов с условиями по продаже жилых помещений (квартир) и машино-мест, принадлежащих ОАО «Минский домостроительный комбинат»

**Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)**

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Квартира по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-5 (2-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 67,4 кв. м, общая площадь по СНБ – 70,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812536); машино-место по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-106 (1-й подземный этаж, площадь – 17,5 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812780) | 233 141,43 | 5 000,00 |
| 2 | Квартира по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-48 (1-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 65,4 кв. м, общая площадь по СНБ – 68,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812579); машино-место по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-151 (1-й подземный этаж, площадь – 17,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812825) | 232 866,95 | 5 000,00 |
| 3 | Квартира по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-69 (6-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 63,5 кв. м, общая площадь по СНБ – 66,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812600); машино-место по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-164 (1-й подземный этаж, площадь – 16,4 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812838) | 218 337,56 | 5 000,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минский домостроительный комбинат», ул. Пономаренко, 43, 220015, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. Карла Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:**

1. победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

2. расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанных на нем прав, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минский домостроительный комбинат», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей, внесшие задаток по соответствующему предмету торгов и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического или физического лица (для физического лица – документ, удостоверяющий личность; для представителя физического лица – документ, удостоверяющий личность представителя и нотариально заверенная доверенность; для представителя юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица), а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в торгах (назначение платежа – задаток для участия 27.09.2022 в повторных аукционных торгах по предмету торгов №__). Участнику, не ставшему победителем торгов (покупателем), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Шаг аукциона, за исключением первого шага аукциона, устанавливается организатором торгов в фиксированной сумме, составляющей **5 000,00 бел. руб.** Первый шаг аукциона устанавливается в фиксированной сумме, составляющей пять процентов от начальной цены предмета торгов.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона. В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом имущества и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 20 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 15 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **27 сентября 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 12.09.2022 по 23.09.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра жилых помещений обращаться по телефонам: (017) 395-48-60, (044) 777-11-58.

**Телефоны для справок:** государственное предприятие «МГЦН» (017) 360-42-22, 365-48-36; ОАО «Минский домостроительный комбинат» (017) 395-48-60, (044) 777-11-58.

Дополнительная информация размещена на официальном сайте организатора торгов – **www.mgcn.by.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

***Упершыню імя Віктара Вабішчэвіча я сустрэў у 1985 годзе на старонках калектыўнага зборніка «Вусны» — чарговай паэтычнай справаздачы сяброў літаб'яднання «Узлёт» пры Белдзяржуніверсітэце. Праўда, на той момант Віктар ужо тры гады як скончыў гістфак і выкладаў гісторыю ў адной са школ Століншчыны. У маладосці заўсёды звяртаеш пільную ўвагу на кожнае новае імя ў літаратуры, але і тады, і пазней Віктар чамусьці друкаваўся вельмі рэдка. А свой першы паэтычны зборнік выдаў аж у 2003 годзе.***

***Калі звяздоўская пошта прынесла цыкл кароткіх апавяданняў гэтага аўтара, я падумаў, што, магчыма, дзякуючы ім многія чытачы адкрыюць для сябе Вабішчэвіча-празаіка. І застаецца толькі пажадаць, каб тых, каму апавяданні прыйдуцца даспадобы, пісьменнік усё ж часцей радаваў сваімі новымі празаічнымі творамі.***

**Алесь БАДАК.**

**Віктар ВАБІШЧЭВІЧ**

# ТАСЬКО

Ён быў з малодшых дзяцей у сям'і. Яго маці, а мая прабабка Лекса, з маладых гадоў была сентыментальнай і лагоднай. Яна балавала сваіх дзяцей, асабліва меншых. Хто ведае, мабыць, яе сэрца ўжо тады прадчувала іх трагічны лёс. Балаваць то яна балавала, але ж яны гадаваліся ў цяжкіх умовах свайго часу. І не цураліся ніякай працы.

Васька з маленства быў добрым і паслухмяным. Ніколі маці не павысіла на яго голасу. І ніколі не называла яго Васілём. Імя яго прамаўляла яна заўсёды пяшчотна і вельмі ласкава — з першых дзён. Шкадавала яго неяк мацней. Заўсёды называла Васечкам. Яшчэ зусім маленькага выцалоўвала ўсяго яго і гаварыла адно і тое ж імя, але толькі па-рознаму. Усе прывыклі чуць тое самае: ох, мой Васечка, ох, мой Масечка, ох, мой Тасечка.

Паступова гэта стала звычкаю. І не толькі маці, а і ўсе пачалі яго так называць. Не кожны раз была ахвота пералічваць усе словы з імя. Часцей гаварылі адно — Тасечка. Вымаўлялі так, як гэта прынята ў нашай гаворцы.

Хлопчык падрастаў, а разам з ім і пасталела, зрабілася больш сур'ёзным і яго імя. І маці, і ўсе вяскоўцы ўжо называлі яго Тасько. Гэтак называлі кожны раз. З гадамі гэта так прыжылося, што многія не маглі нават і згадаць яго сапраўднага імя.

У вайну іх вёска, як і ўсе суседнія вёскі і хутары, была спалена. Жыць давялося ў лесе, у станках. Пасля вызвалення нашай мясцовасці ад ворага хлопца забралі на вайну. Там ён быў Дзярачыц Васіль Іванавіч. Вайна не пашкадавала яго, моцна патрапала і знявечыла. Але хлопец выжыў.

Дахаты вярнуўся з цяжкімі раненнямі. І зноў загучала яго звыклае імя — Тасько. Трэба было жыць. І ён жыў, хоць і даймалі раны. Думаў пра заўтрашні дзень. Працаваў, як і ўсе. Ажаніўся, нарадзілася двое дзетак — адно за другім. Пабудавалі хату. Але раны не давалі спакою, раз за разам выходзілі аскепкі, даводзілася шукаць рады. З Бераставога падводаю везлі ў Рубель, а далей — у Гарадок, да ўрачоў. Гэта рабілася ўсё часцей і часцей.

Аднойчы яго не ўдалося выратаваць. Тады, у пяцьдзясят першым, было гэта не пад сілу. Дзеткі Леначка і Міша засталіся маленечкімі сіротамі.

Пражыў ён усяго нейкіх там гадоў трыццаць. Ніхто тады не дзякаваў былому воіну за жыццёвы подзвіг і за перамогу. Крыж на магіле збуцвеў, таму дачка потым паставіла новы помнік.

Мне не ўдалося б знайсці той помнік на хатамскіх могілках, каб не падказаў надпіс. Імён і прозвішчаў у нас многа аднолькавых. Падчас цяжка высветліць, хто пахаваны, каго ўвекавечыў пэўны надпіс. Але тут была надзейная падказка: пасля ўсяго, што звычайна пішуць на помніках, сціпла дапісана — Тасько. Ніякага сумнення быць не магло. Гэта — свой.

# ХУТКАЯ ДАПАМОГА

Лёгкім яе жыццё назваць нельга: ад самага нараджэння хапала ўсялякіх цяжкасцяў і згрызотаў. А потым іх станавілася ўсё больш, зноў і зноў прыходзілі непрыемнасці і выпрабаванні.

Яна скончыла школу, хацела пайсці вучыцца далей, але пачалася вайна. Усе задумы рухнулі ў адзін момант. Давялося перажыць варожую акупацыю. Удзень гаспадарылі немцы, а ноччу з'яўляліся партызаны. Шмат усяго прыйшлося тады нацярпецца. Потым іх сям'я аказалася ў савецкім тыле, у эвакуацыі. Бацька і чатыры браты яе, усе былі музыкамі, ваявалі — хто на фронце, хто ў абозе.

Пасля вайны яна вучылася год, на курсах. Па размеркаванні трапіла ў Гарадок на верф. У Беларусь прыехала, бо тут жыў яе старэйшы брат, кадравы вайсковец. Тоня, Тонечка на працы стала Антанінай Сяргееўнай. Неўзабаве выйшла замуж, нарадзіла сына. Працавала вельмі добра, ніколі не шкадавала сябе. Таму не дзіўна, што яе старанпасць у хуткім часе заўважылі і яна апынулася ў райкаме партыі, на адказнай пасадзе. Шмат партыйных білетаў выпісала яна — для ўсяго тагачаснага раёна. Калі раён скасавалі, яна працавала ў іншых месцах, усюды выдатна спраўлялася.

Яшчэ ў маладосці ў яе міжволі выпрацавалася звычка — перамяшчацца толькі подбегам: хацелася ўсюды паспець, бо чакала яе праца і дома. Заўжды трымала вялікую гаспадарку: карова, свінні, куры. Амаль што ніколі не хварэла: не было калі дый не было за кім. Мужа шкадавала.

Свайго сына выгадаваць не паспелі. Антаніна Сяргееўна аўдавела. Праз некаторы час у мужавага сябра памерла жонка. Жыў ён у іншым горадзе, далёка ад Гарадка, але неўзабаве прыехаў да знаёмай удавы і прапанаваў ёй гадаваць дзяцей разам. Яна адмовілася. Усе знаёмыя падтрымалі яе.

Але ён не адставаў, прыязджаў некалькі разоў. І яна пасля доўгіх роздумаў нарэшце згадзілася. А думаць сапраўды было варта, бо ішла да чацвярых дзяцей. Што толькі не казалі тады на яе! Ніхто не саромеўся ёй у вочы гаварыць амаль аднолькавае: «Здурэла, ашалела!»

Трыццаць гадоў пражылі яны разам — не толькі выгадавалі дзяцей, але і ўсіх давялі да ладу. Для ўсіх дзяцей яна заўсёды была мамаю — не толькі для свайго роднага сыночка. І ўсіх іх называла сваімі, усіх аднолькава шкадавала. Ніколі не будзіла раніцай выганяць карову, бо заўсёды ўспаміналa, як сама калісьці ў дзяцінстве ў сваёй Сосніцы не хацела ўставаць рана.

Некаторых яе дзяцей няма ўжо — лёс ніколі не быў літасцівым да гэтай жанчыны. Дзеці і ўсе ўнукі, здаецца, заўсёды памятаюць яе, часта адведваюць, прыязджаюць з розных гарадоў. Не кожны ўнук здольны гэтак любіць сваю бабулю, сваю родную, як любяць яе ўнукі.

Зараз ёй дзевяноста пяць гадоў, сілы не тыя, але ж яна застаецца такою самаю, як і калісьці. Кожнага яна пашкадуе, прыйдзе на дапамогу. Колькі разоў яна карміла тых, што не маюць капейкі за душою! А і раней жа было гэтак. Калі кватаранту няма чым плаціць, ён абавязкова будзе жыць у Антаніны Сяргееўны. Некалі абзавядзецца якім рублём, тады і разлічыцца. А калі не захоча заплаціць, то і так можна абысціся. Калі чалавеку патрэбна дапамога, то нехта ж мусіць дапамагаць. Не адзін раз чулі ад яе падобныя словы. І яна спяшаецца дапамагаць. Па сваёй ранейшай звычцы стараецца ісці подбегам, каб паспець больш зрабіць. Такія вось клопаты гэтага надзвычай добрага чалавека.

Неяк я сустрэўся з ёю каля аптэкі. Паспачувала, што ўжо ў такім узросце хварэю. А калі даведалася, што я прыходзіў па лекі для цешчынай суседкі, доўга дзякавала мне. Дзякавала — трэба было бачыць, як шчыра.

З нейчай лёгкае рукі яе сталі называць «хуткаю дапамогаю». Паглядзіш, як яна некуды спяшаецца, адразу разумееш: правільна кажуць. Гэта сапраўды пра яе.



# НАЙСМАЧНЕЙШЫЯ ПАМІДОРЫ

Пасля медыцынскага інстытута Яўген застаўся ў вялікім горадзе. З гэтым горадам ён думаў звязаць усё сваё далейшае жыццё. Вабіла вялікая навука, мроіліся даследаванні і адкрыцці. Працаваў ён у адной з бальніц горада. Праца падабалася і ўсё ў яго ішло добра.

Яшчэ са студэнцкіх часоў было ў яго і каханне. Яна таксама ўрач. І працавала зусім побач. Ужо тады яны ішлі разам.

Прыйшоў той час, што яны вырашылі пабрацца шлюбам. Гэтага чакалі ўсе: і сваякі, і сябры, і знаёмыя. Ніхто толькі не ведаў, што яны, маладыя, не маглі нават уявіць свайго шлюбу без вянчання.

У тыя часы пра вянец нідзе не было чуваць, хоць вяселляў было вельмі многа. Вянчаліся надзвычай рэдка. Ды і то гэта быў у асноўным просты вясковы люд, які не асабліва дзе вучыўся. Каго не маглі за гэта папрасіць звольніцца з працы. Але каб урачы?

А Яўген інакш не мог: ён гадаваўся ў сям'і, якая ўсё жыццё ішла з Богам у сэрцы, нават тады, калі гэтага ёй не дазвалялі. Нават тады, калі яна за гэта магла застацца без кавалка хлеба. Так аднойчы і здарылася.

Бацька яго быў настаўнікам, выкладаў у школе фізіку. Вучыўся ён яшчэ да вайны, пры Польшчы. З дзяцінства хадзіў у царкву, вырас чалавекам набожным. З цягам часу пра набожнасць настаўніка стала вядома ўладам. Тады перад ім катэгарычна паставілі пытанне, што ён павінен вызначыць: заставацца і далей з Богам ці працаваць у школе. Нічога іншага не дапускалася. Бацька не змог змяніць сваіх перакананняў. Давялося пакінуць школу. Некаторы час яго вялікая сям'я перабівалася з капейкі на капейку, а потым ён уладкаваўся на завод.

Яўген і яго каханая вырашылі вянчацца недзе ў глухой мясцовасці, каб на гэта не было асабліва каму звяртаць увагу. Яна была з горада, таму трэба было ехаць недзе бліжэй да Яўгенавай радзімы.

Пра яго родны Гарадок не дапускалася і гаворкі: там гэта не магло прайсці, каб не заўважылі, каб не паведамілі, куды трэба. Горад зусім маленькі, і ўсё, што робіцца ў ім, відаць як на далоні, не схаваеш нікуды. Таму дамаўляцца прыйшлося ажно ў Аздамічах. Там знаходзілася самая аддаленая царква. Да таго ж — ніхто з гарадчукоў не жыў. За тою вёскай хоць і былі яшчэ вёскі, але ў іх не было ні царквы, ні каплічкі. А далей цягнуліся бясконцыя лясы, бары і непраходныя балоты.

Машын тады было вельмі мала, а пра асабісты легкавік у двары ніхто і падумаць не мог. Давялося ехаць раніцай, самым першым аўтобусам.

Дзень быў будні. Пакуль арганізавалі вянчанне, прайшло нямала часу. А потым — сам вянец. Зрабілася ўсё недзе ажно пасля абеду. Радасныя і задаволеныя маладыя прыйшлі на аўтобусны прыпынак. Патрэбны аўтобус ішоў толькі ўвечары, але думалася, нехта падвязе і раней.

Але не было ніводнай машыны. Калгасны транспарт пайшоў у раён яшчэ раніцай і зараз пачынаў паціху вяртацца.

Маладыя чакалі. Чакалі доўга. Моцна хацелася есці: зранку і да самага вянца гэтага рабіць нельга было. Нешта ўзяць з сабою? Пра позняе вяртанне ніхто не падумаў. Яны цярпліва чакалі. Марным было б спадзяванне на нешта іншае.

У вёсцы не маглі не заўважыць незнаёмых. Кінулася ў вочы іх доўгае чаканне на прыпынку. Адна спагадлівая душа нават хацела дапамагчы ім. Але што яна магла зрабіць? Транспарту якога-небудзь не было. Яна прынесла хоць крышку падсілкавацца. Узяла самае простае, што было пад рукою: памідоры і хлеб. Яна тады і ўявіць сабе не магла, як жа дарэчы будуць тыя памідоры, якімі яны аказуцца жаданымі і смачнымі.

З таго часу прайшло шмат гадоў. Яўген па-ранейшаму застаўся верным навуцы. Ён не проста займаецца медыцынай. Мае высокія званні і ўзнагароды. Як вучоны ён вядомы і за мяжою, у розных краінах. Часта бывае там. Сустракалася ў жыцці і многа адмысловых заморскіх пачастункаў. Былі і памідоры самых розных сартоў. Смакоцця бачыў нямала. Растуць на лецішчы і свае памідоры. Вельмі добрыя — нічога не скажаш.

Але ніколі больш не еў ён такіх смачных памідораў, як тыя, што прынесла калісь незнаёмая жанчына ў аддаленай палескай вёсцы. Ён часта згадвае пра іх. Гэта былі самыя смачныя памідоры ў жыцці.

# «МЯНЕ ЗАВУЦЬ САША. І Я — КВЕТКАГОЛІК»

## Жыхар Рагачова можа займацца кветкамі 24/7 і не стамляцца



Любімая і галоўная "кветка" Аляксандра — дачушка Васіліса. Ужо на працягу дзевяці гадоў перад Купаллем ён пляце ёй васільковы вянок і ладзіць з ім фотасесію. Такая вось прыгожая сямейная традыцыя.

**ХТОСЬЦІ, калі не можа заснуць, лічыць авечак. А Аляксандр АЛЕСІК — кветкі. Падснежнікі, прымулы, пралескі, гіяцынты, цюльпаны, нарцысы... Іх у яго на лецішчы, што ў вёсцы Стрэнькі пад Рагачовам, некалькі сотняў відаў. Але на гэтым мужчына спыняцца не збіраецца. «Я Саша. І я — кветкаголік, — жартуе. — Ужо больш за 20 гадоў у мяне залежнасць. І я не хачу завязваць. Рэчы з дому пакуль не выношу, але на новы расток са свайго спіса «хацелак» не пашкадую апошні рубель». Бо кветкі для мужчыны — нешта большае, чым проста захапленне.**



Калі ў Аляксандра АЛЕСІКА будзе выбар: купіць сабе на апошнія грошы паесці ці кветкі — не раздумваючы, выбера апошняе.

### МАЯЧОК-НАПАМІН ДЛЯ МАМЫ

Любоў, аж да фанатызму, здарылася яшчэ ў дзяцінстве. Саша нарадзіўся ў вёсцы Ланская, што на Палессі, у шматдзетнай сям'і. Ён сёмы з дзесяці дзяцей.

— Быць часткай вялікай дружнай сям'і — сапраўдны дар. Але ў яго ёсць свой кошт — выразная нястача. Бацькі шмат працавалі, але, вядома, грошай не заўсёды хапала, таму жылі мы сціпла. І вось каб упрыгожыць няхай і вельмі шчаслівае, але няпростае жыццё, я заняўся кветкамі. Для мяне яны згладжвалі вуглы беднасці. А яшчэ я ведаў, што ў рэдкія свабодныя хвіліны кветкамі любуецца мама. Так я пачаў разбіваць клумбы паўсюль, дзе гэта было магчыма: каля парога, на вольным лапіку зямлі пад заборам, уздоўж сцяжынкі да хлеўчука.

Свядома першыя кветкі Саша пасадзіў у пятым класе. У школе на ўроку працы збіралі насенне, і настаўніца дазволіла забраць сабе лішкі.

— А аднойчы я падгаварыў малодшых братоў аб'яднаць свае зберажэнні і заказаць насенне з каталога. Яго было так шмат! Работніца паштовага аддзялення падумала, што гэта памылка, і адправіла ўсё назад. Але я змог вярнуць пасылку. Колькі было радасці! У тую зіму, калі рабілася сумна ці складана, я перабіраў, разглядаў гэтыя стракатыя пакецікі з насеннем. Для мяне яны былі сімвалам вясны і новай яркасці ў ёй.

Ішоў час, многае мянялася. А кветкі па-ранейшаму заставаліся ў жыцці Алесіка. Неяк прызнаўся, што гатовы займацца імі 24 гадзіны ў суткі і не стамляцца. «Кветкі патрабуюць шмат увагі. Але для мяне гэта прыемныя клопаты».

Чамусьці вырошчванне кветак здаўна прынята лічыць чыста жаночым захапленнем. (Хоць хапае мужчын-кветкаводаў, у тым ліку і з сусветнымі імёнамі. Напрыклад, у калекцыі Альфрэда Хокенмаера з Германіі больш за 500 відаў архідэй, тульскі селекцыянер Алег Дарагану вывеў 150 сартоў вяргінь, калекцыя руж нашага земляка Івана Сікоры ў 1930-я гады лічылася адной з найлепшых у Еўропе.) Таму па першым часе насмешлівую фразу «кветкі не для мужыкоў!» наш герой чуў пастаянна. «У маім дзяцінстве лічылася, што хлопец павінен лупіць малатком па цвіках, страляць папяроскі ды пільнаваць, як падабраць вечарам бацькаў матацыкл з гаража. А люціка — толькі для дзяўчынак. Цяпер жа ўсё памянялася. І нават тата, які ніколі не раздзяляў маё захапленне, змяніў да яго сваё стаўленне».

Сваю першую ружу Саша пасадзіў 12 гадоў таму. Тады ён ужо дакладна ведаў, што пасля ўніверсітэта паедзе жыць на Гомельшчыну.

— Хацелася пакінуць дома нейкі яркі маячок-напамін для мамы. Каб яе вока радавалася, адцягваючы душу ад непазбежнай трывогі за сына, якія падаўся ў прымакі. Памятаю, са стыпендыі адклаў грошай на польскі саджанец. Да пасадкі падышоў з усёй адказнасцю. Выбраў месца каля самага парога, памяняў грунт, падсыпаў угнаенне. У разгар работ падышоў тата. Даведаўшыся, чым займаюся, ён выказаўся на вельмі каларытнай мове. Калі перакласці — прапанаваў мне кінуць дурное і зрабіць штосьці карыснае ў агародзе. Іншага я і не чакаў. Ён ніколі асабліва не раздзяляў маёй любові да кветак. Ружа прыжылася. Летам падчас тэлефонных размоў мама часта падкрэслівала, як любуецца «Сашынай ружачкай». Восенню абавязкова паведамляла, што кветка накрытая перад маразамі, а вясной распавядала пра яе стан пасля зімоўкі. Некалькі гадоў таму я са здзіўленнем даведаўся, што восенськія клопаты па ружы ўзяў на сябе тата. Ён майструе цэлую канструкцыю, пад якой куст перажыве нават самыя лютыя маразы. І ружа такой гіперапецы толькі ўдзячная: штосезон яна радуе яркімі бутонамі і вельмі далікатным водарам.

Не так даўно вясной Саша купіў яшчэ некалькі кустоў руж і паехаў на радзіму. Вазіўся з іх пасадкай, амаль як 12 гадоў таму. Зноў падышоў тата.

«Саша, можа, трэба зямлі ў ямы насыпаць ці ўгнаення якога? — спытаў ён. — Дзякуй, тата. Я ўжо ўсё падрыхтаваў. — А даглядаць іх гэтак жа, як і той куст? — удакладніў ён. — Ага! — здзіўлена выціснуў з сябе я. — Ясна, але давай тут крыху акуратней, а то вунь, на іншую кветку наступіў».

Шчыра, я так і застыў з саджанцам у руках. Тата пайшоў па сваіх справах, я працягнуў свае. Унутры было вельмі добра. Быццам ты некалькі гадоў вазіўся з капрызнай раслінай, а ў адзін цудоўны дзень застаў яе квітнеючай. І ў гэты момант табе абсалютна ўсё адно: выстраліла штосьці з тваіх стараннаў, ці проста прыйшоў патрэбны час. Галоўнае ж, зацвіла».

### «РАСЛІНАМ, ЯК І ЛЮДЗЯМ, ПАТРЭБНАЯ ЎВАГА»

Любімая і галоўная «кветка» Аляксандра — дачушка Васіліса. Ужо на працягу дзевяці гадоў перад Купаллем ён пляце ёй васільковы вянок і ладзіць з ім фотасесію. Найлепшы кадр упрыгожвае каляндар, які мужчына робіць да Новага года ў падарунак блізкім. Такая вось добрая традыцыя.

Найлепшы ж падарунак для самога Аляксандра — натуральна, кветкі. Прычым ён любіць іх не толькі атрымліваць, але і дарыць. Нядаўна назірала на яго старонцы ў сацыяльных сетках: перад тым як ехаць на Брэстчыну да бацькоў, мужчына клапатліва збіраў для іх кветкавую кардонку, адмыслова падбіраў віды, непатрабавальныя ў доглядзе: спірэі, мультыфлоры, шылападобныя флёксы, лаванда, гейхеры, армерыі, званочкі, рамонкі, смолкі... «Высаджваў расліны з думкай, што яны для мамы. Праўда, з-за праблем са здароўем яна цяпер мала імі любуецца. Амаль не выходзіць у двор. Але ведаю:



Амаль з кожнай кветкай на клумбах у мужчыны звязаная нейкая душэўная гісторыя.

калі зацвітуць, ёй абавязкова збяруць букет у пакой. Яна ўзрадуецца, усміхнецца, падумае пра мяне».

Высяваць кветкі Аляксандр пачынае ў лютым. Усе падаконнікі і балкон у яго рагачоўскай кватэры заста́ўлены гаршчкамі. Мужчына клапоціцца пра кожны расток, палівае, падкормлівае з піпеткі. «Кветкі — гэта мая тэрапія. Яны прыводзяць думкі ў парадак. Вучаць быць уважлівым, цярплівым. Вядома, можна купіць гатовыя саджанцы, але яны будуць нашмат даражэйшымі. Ды і куды цікавей самому з малюпасенькага зярнятка вырасціць кветку неверагоднай прыгажосці». Вясной Аляксандр пачынае перавозіць вазоны з петуніямі і іншымі гадаванцамі на лецішча.

Калі пытаюся, колькі кветак яму патрэбна для шчасця, смяецца. «Пакуль ёсць хоць адно вольнае месца на клумбе, я шукаю, што туды пасадзіць. А калі апошнія сантыметры засяляцца, пачынаю ўшчыльняць зялёных жыхароў ці пашукаю адшукаць для іх новыя тэрыторыі». Прызнаўся, што нават калі нейкая кветка лішняя, ён не зможа выкінуць ніводнага растка. Менавіта таму і стварыў спецыяльна для кветкаводаў Рагачова чат, каб такія ж аматары, як ён, маглі абменьвацца лішкамі раслін і дзяліцца досведам. «Мне вельмі пашанцавала з цесцем і цешчай, яны падтрымліваюць маё захапленне. Вось і сёлета ў чарговы раз выдзелілі з-пад гароднiны пад мой «гадавальнік» яшчэ адну градку».

Яшчэ ў школьныя гады кожную раніцу Саша пачынаў з абходу клумбаў. Глядзеў, ці распусціўся дзе новы бутон. З таго часу нічога не змянілася. Штораз, калі прыязджае ў Стрэнькі (а летам ён там жыве), перш-наперш аббягае свае кветкавыя ўладанні. Нават увечары.

### У ЖЫЦЦІ НЕ ХАПАЕ ПРАСТАТЫ

А яшчэ ў Аляксандра Алесіка ёсць дар — ён вельмі тонка адчувае людзей. І з лёгкасцю можа вызначыць, да якой расліны вы падобныя. Мне здаецца, што з яго атрымаўся б выдатны кветкавы астролаг. Прынамсі, я, паводле яго слоў, падобная да вапнаўкі: «Такая ж кранальная і лёгкая, але з моцным стрыжнем». Мне спадабалася, як выглядае гэтая кветка ў інтэрнэце, таму, думаю, налета на маёй клумбе таксама з'явіцца новы жыхар. Сам жа Аляксандр кажа, што падобны да пазнацвета. «Мы абодва галоўнае робім у апошні момант, умеем да пары да часу быць непрыкметнымі і жыць па незразумелых для многіх правілах. А яшчэ — вельмі некамфортна адчуваем сябе ў адзіночных пасадках».

Аляксандр не толькі атрымлівае асалоду ад вырошчвання кветак, але і займальна піша пра іх на сваёй старонцы ў «Інстаграме» @sasha_bukvovod. Напрыклад, менавіта дзякуючы яго допісу я па-іншаму паглядзела на сціплы і на першы погляд незаўважны ворлік, які расце практычна ў кожнай вясковай бабулі перад хатай. «На маю альпійскую горку званочкі чарнільнага і вішнёвага колеру пераехалі з палісадніку Васілісінай прабабулі Дуні. Раней гэтыя кветкі з-за прастаты падаваліся мне надта вясковымі, таму хутчэй узяў іх «у нагрузку» і забыўся. У выніку ворлік некалькі гадоў вёў барацьбу за выжыванне. За гэты час прабабулі, якая стала роднай і для мяне, на жаль, не стала. Вясной зусім выпадкова знайшоў кусцік сярод злакаў. Абрадаваўся яму, як светламу ўспаміну. «Ах, ты ж мой прыгажун, — пачаў звыклы дыялог з кветкамі. — Цяпер мы будзем цябе ратаваць: добра выпалем вакол, падрыхлім...» Падумалася, што з кветкай гэтаксама магла размаўляць і яго мінулая гаспадыня. Цяпер аквілегія (гэта «афіцыйная» назва ворліка) не падаецца мне вясковай прастачкай. Тая прастата, што адштурхоўвала раней, стала яе ўпрыгажэннем». Сёлета Аляксандр накупіў насення ворліка розных відаў. Калі эксперымент удасца, абяцаў падзяліцца вытанчанай прастатой з іншымі. «Бо менавіта яе ў апошні час усё часцей не хапае ў нашых жыццях».

Амаль з кожнай кветкай на клумбах у мужчыны звязаная нейкая душэўная гісторыя. Напрыклад, півоні асацыююцца са школьнымі экзаменамі. «Як у большасці вясковых школ, мы не куплялі букеты для камісіі. Проста размяркоўвалі: каму і да якога экзамену трэба раздабыць прыстойныя кветкі. Звычайныя касачы, якіх было валам ва ўласным палісадніку, не каціраваліся, прыходзілася шукаць штосьці іншае. Я прасіў півоні ў кволенькай бабулі з добрымі вачыма. Кветкамі яна заўсёды дзялілася без кроплі шкадавання, стараючыся выбраць моцныя бутоны, каб букет атрымаўся дабротным. Нарэзаўшы добры ахапак, заўсёды шчыра жадала поспеху і высокай адзнакі... З тых часоў ужо прайшло больш за пятнаццаць гадоў, на маім шляху было шмат экзаменаў, не толькі школьных і ўніверсітэцкіх, але і жыццёвых — толькі штораз, калі я бачу першыя півоні, згадваю тую добрую бабулю. Яна пакінула ў маёй душы пасля сябе светлы след. Таму я таксама ніколі не шкадую кветак і шчодра імі дзялюся. Хочацца, каб прыгажосць вакол множылася і дарыла прыемныя эмоцыі іншым людзям. Ведаеце, як кветкаводу стаць багацейшым? Гэтак жа, як і чалавеку, які марыць стаць шчаслівым. Трэба не баяцца аддаваць. Тады да цябе вернецца яшчэ больш».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота з асабістага архіва героя.**

# Галоўная поўня года

## У Паднябеснай адзначаюць свята сярэдзіны восені

**У Кітаі з гэтай нагоды трохдзённыя вакацыі. Свята сярэдзіны восені (Чжунцюцзэ), або, як яго яшчэ называюць, свята Месяца — другое па значнасці ў Паднябеснай пасля кітайскага Новага года, адзначыла «Жэньмінь жыбаа» анлайн». З 2008-га Чжунцюцзэ быў уключаны ў спіс нацыянальных святаў краіны. 20 мая 2006 года Дзяржсавет КНР унёс свята сярэдзіны восені ў спіс першай партыі Дзяржаўнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Паўната спадарожніка нашай планеты сімвалізуе адразу некалькі важных для кітайцаў паняццяў — гэта знак урадлівасці, яднання сям'і, завяршэння збору багатага ўраджаю. Звычайна Чжунцюцзэ выпадае на 15-е чысло восьмага месяца па месяцавым календары. Сёлета гэта якраз 10 верасня. І, па шчаслівым збегу абставін, настала поўня. Так што самы час паназіраць за чароўным Месяцам. Што, уласна кажучы, кітайцы з задавальненнем і робяць. Яны па праву лічаць цяперашнюю поўню галоўнай у годзе.**



### БАГІНЯ МЕСЯЦА

Адзначаць свята сярэдзіны восені пачалі яшчэ больш чым тры тысячагоддзі таму ў часы дынастыі Шан. Пакланенне Месяцу заўсёды было важнай часткай кітайскай культуры. Існуе мноства розных міфаў, звязаных з паходжаннем свята. Адзін з самых папулярных — гэта рамантычная легенда пра народнага героя Хоу І і яго верную жонку Чан Э.

Паводле паданняў, калісьці на небасхіле свяцілі дзесяць сонцаў, спальваючы на зямлі ўвесь ураджай і прыносячы невымерныя бедствы. Адважны герой Хоу І змяніў ход падзей. Трапнымі стрэламі ён збіў з неба дзевяць сонцаў, пакінуўшы адно, якое з гэтага часу свяціла толькі днём. Людзі былі бязмерна ўдзячныя свайму выратавальніку. Нават Нябесная Імператрыца выказала сваё прызнанне Хоу І і паднесла яму падарунак — чароўны эліксір. Яго сіла магла ператварыць чалавека ў несмяротнае бажаство, якое вечна пасяляецца на нябёсах.

Хоу І горача любіў сваю жонку і не жадаў расстання з ёй, нават наўзамен на вечнае жыццё. Ён папрасіў Чан Э прыхаваць эліксір, а сам тым часам адправіўся на паляванне. Скарыстаўшыся адсутнасцю Хоу І, адзін з яго вучняў, Фэн Мэн, вырашыў займець запаветнае зелле. Ён прыйшоў у дом свайго настаўніка і, пагражаючы яго жонцы, патрабаваў аддаць яму эліксір. Але Чан Э не магла гэтага дапусціць і выпіла ўсё сама. У гэты ж момант яна ўзнялася на нябёсы. Але ёй было складана пераносіць расстанне з каханым, і, каб быць да яго бліжэй, Чан Э пасялілася на спадарожніку Зямлі. Сіла эліксіру зрабіла яе багіняй Месяца.

Калі Хоу І вярнуўся дадому з палявання і даведаўся пра тое, што здарылася, яго смутку не было межаў. Кожную ноч ён узнімаў свой погляд да нябёсаў і клікаў каханую. Менавіта 15-га чысла 8-га месяца Месяц быў надзвычай яркі, і Хоу І здалося, што ў гэтую поўню ён бачыць постаць Чан Э. Ён папрасіў сваіх усталяваць алтар, каб пакланіцца ёй і выказаць свой смутак. Вельмі хутка пагалоска распаўсюдзілася сярод людзей, і ўсе даведаліся, што Чан Э ператварылася ў багіню Месяца. Людзі пачалі пакланяцца ёй, просячы аб дабрабыце і яе заступніцтве. З часам гэта стала традыцыяй, якая дайшла да нашых дзён.

### ЧАРОЎНЫЯ ПРЫСМАКІ

Галоўнай стравай у гэты дзень лічыцца юэбін — месяцовы пернік. Гэта салодкае печыва, якое гатуецца на пары і звычайна падаецца з духмяным кітайскім чаем. Паколькі юэбін сімвалізуе паўнату і адзінства, падчас Чжунцюцзэ кітайцы ядуць месяцовыя пернікі разам з роднымі і сябрамі. Юэбіны — гэта таксама выдатны падарунак, каб выказаць любоў і пажадаць блізкім доўгага і шчаслівага жыцця. Хоць тыповыя месяцовыя пернікі звычайна невялікія, некаторыя з іх дасягаюць гіганцкіх памераў. У Кнігу рэкордаў Гінеса ў 2007 годзе быў занесены прысмак дыяметрам звыш васьмі метраў і агульнай вагой амаль 13 тон!

Асноўны інгрэдыент месяцовых пернікаў — яечны або качыны жаўток, а рыхтуецца гэты ласунак з рознымі начыннямі. Сярод найбольш распаўсюджаных — бабовая паста, корань лотаса, садавіна і нават мяса. Найбольш вядомыя юэбіны — пекінскія, сучжоўскія, гуанчжоўскія і чаачжоўскія. Пернікі, як правіла, робяць круглымі, што сімвалізуе поўны Месяц. Большасць месяцовых пернікаў салодкія на смак, але не ўсе. Бываюць і салёныя, і вострыя. Штогод пекары імкнуцца разнастаіць існуючы асартымент і прыдумляюць новыя варыянты. Узоры і надпісы на перніках з'яўляюцца сімваламі дабрабыту і шчасця, прычым яны могуць адрознівацца ў залежнасці ад горада ці правінцыі. Падарункавыя скрынкі для месяцовых пернікаў звычайна не саступаюць па прыгажосці самім здобным вырабам.

Напярэдадні свята сярэдзіны восені кітайскія ўлады ўзмацнілі кантроль за цэнамі на месяцовыя пернікі (юэбіны), якія з'яўляюцца традыцыйным далікатэсам і папулярным падарункам на свята сярэдзіны восені, перадае «Жэньмінь жыбаа» анлайн». Паводле даных Дзяржаўнага камітэта па справах развіцця і рэформаў, ведамствы па кантролі і рэгуляванні рынка праводзяць праверкі прадпрыемстваў, гатэляў, рэстаранаў і платформаў электроннай камерцыі, якія займаюцца вытворчасцю або продажам месяцовых пернікаў і строга караюць іх пры выяўленні адпаведных парушэнняў.

Яшчэ ў чэрвені камітэт сумесна з трыма іншымі ўрадавымі органамі выпусціў апавяшчэнне, у якім адзначалася недапушчальнасць выкарыстання каштоўных металаў, чырвонага дрэва або іншых дарагіх матэрыялаў пры стварэнні пакавання для месяцовых пернікаў. Акрамя таго дакумент таксама забаронены продаж падарункавых каробак, у якіх месяцовыя пернікі спакаваныя разам з іншымі таварамі. Нельга выкарыстоўваць у якасці начыння для юэбінаў дарагія інгрэдыенты, такія як акулавыя плаўнікі і ядомыя ластаўчыны гнёзды. У ведамстве таксама адзначылі, што пры выяўленні скрынь з папулярным святочным ласункам, кошт якіх перавышае 500 юаняў







(каля 75 долараў), пры неабходнасці будзе праводзіцца праверка сабекошту.

### «ФІШКІ» ЧЖУНЦЮЦЗЭ

Поўня ў сярэдзіне восені традыцыйна лічыцца найлепшым часам для шлюбу. У кітайскай міфалогіі бог Месяца адказвае за сардэчныя справы, таму ў гэты перыяд мноства пар бяруць шлюб, спадзеючыся на заступніцтва нябёсаў. Выраб і развешванне ліхтарыкаў адносіцца да асаблівых традыцый свята сярэдзіны восені. Звычайна яны аформлены ў шчаслівым чырвоным колеры, але няма абмежаванняў для крэатыву. Нярэдка на ліхтарыках пішуць загадкі, каб людзі маглі з задавальненнем разгадваць з сябрамі або сям'ёй. Часта іх развешваюць у парках, запускаюць у неба і па вадзе, таму шмат людзей шпацыруюць святочнымі вечарамі, каб паглядзець на восеньскія агеньчыкі. У некаторых парках усталёўваюць сцэны і паказваюць святочныя прадстаўленні, у іншых жа праводзяцца парады. Гэты фестываль вядомы таксама двума танцамі — танцам ільва і танцам дракона.

Кажуць, што ў гэты дзень месяцовы дыск самы яркі і круглы у годзе. Вобраз «паўнаты» фігуруе ў некалькіх сэнсах: гэта час завяршэння збору ўраджаю, спадарожнік Зямлі з'яўляецца сімвалам жаночага пачатку, яе паўната — таксама сімвал урадлівасці. Паводле кітайскай традыцыі, спадарожнікам Чан Э на месяцы з'яўляецца трусік, які таўчэ ў ступе зёлкі неўміручасці, седзячы пад карычным дрэвам, а таксама трохногая жабка — сімвал жаночага пачатку. Свята адзначаюць ўсёй сям'ёй, і семантыка «кола сям'і» прысутнічае ў падзеле пернікаў на ўсіх. Паставіць свечку ў курыльніцу каля храма — адна са старажытных традыцый свята сярэдзіны восені. У гэты час кожны загадвае жаданне. Жадаюць звычайна здароўя блізкім, дабрабыту сям'і.

Гэтае свята, як і кітайскі Новы год, жыхары Паднябеснай імкнуцца сустрэць у сямейным коле. Таксама ў гэты дзень прынята выстаўляць на стол кавуны, яблыкі, фінікі і слівы. У розных частках Кітая яго адзначаюць па-свойму, адзначае «Жэньмінь жыбаа» анлайн». У горадзе Пучэн жанчыны збіраюцца, каб перайсці праз мост Наньпу. Яны вераць, што гэта прынясе ім даўгалецце. Жыхары Цзяньніна развешваюць лямпы, каб памаліцца за дзяцей. У Шаньтоў галоўная страва святочнага стала — клубні тара, у той час як у Нанкіне гэта качка, прыгатаваная з кветкамі духмянай масліны. У некаторых раёнах робяць невялікія пагады з чарапіцы з адтулінамі на даху. У свята іх напаўняюць дровамі і падпальваюць. У полымя сыплюць спецыяльны парашок, гэта сімвалізуе багацце і дабрабыт.

А жыхары павета Лун'янь звычайна дастаюць цэнтральную частку перніка для старэйшых. Гэта азначае, што ёсць таямніцы, пра якія маладыя не павінны ведаць. У павеце Усі, што ў правінцыі Цзянсу, увечары напярэдадні свята сярэдзіны восені людзі запальваюць ладан «доўсян». Гаршчок абкладваецца шоўкам, на якім намаляваныя карціны Месяца. Ёсць і іншыя ўпрыгажэнні цырыманіяльнага посуду. А жыхары Шанхая п'юць віно са смакам духмянага асмантусу. У павеце Цзіань правінцыі Цзянсу пры заканчэнні свята сярэдзіны восені ў кожнай вёсцы паляць гаршчок саломы. Пасля таго як гаршчок стаў чырвоным, у яго наліваюць воцат, і па ўсёй вёсцы разносіцца прыемны водар.

У правінцыі Аньхой дзеці плятуць коскі з саломы, а дарослыя танчаць з саламяным драконам. Жыхары Сычуань ласуюцца юэбінамі, а таксама гатуюць мясцовыя тарты «ба» і ядуць качку. У некаторых месцах яшчэ над варотамі вешаюць лямпы ў мандарыны, адзначаючы свята сярэдзіны восені. У павеце Луань правінцыі Шаньсі на ўрачыстыя банкеты запрашаюцца зяці. У павеце Датун юэбіны называюць «пернікам для сустрэчы родных пасля расстання». Жыхары павета Хэцзянь правінцыі Хэбэй лічаць дождж на Свята сярэдзіны восені «горкім». Калі ён ідзе ў гэты дзень, то лічыцца, што гародніна абавязкова будзе нясмачная. Мужчыны павета Сісян правінцыі Шэньсі ўвечары катаюцца на лодках і падымаюцца ў горы, жанчыны ладзяць банкеты. Усе абавязкова ласуюцца кавунамі. У павеце Лочуань правінцыі Шэньсі бацькі школьнікаў з падарункамі наведваюць настаўнікаў, віншуючы іх са святам. Яны звычайна абедаюць у школах.

Традыцыю працягваюць не толькі ў Паднябеснай. Гэта адно з самых любімых і чаканых свят у Сінгапуры, Ганконгу, Філіпінах, Японіі, Малайзіі і іншых краінах Азіі, дзе пражывае шмат этнічных кітайцаў. Не застаецца ўбаку і Беларусь. Гэтымі днямі ў нас таксама можна пабачыць святочны антураж Чжунцюцзэ. У прыватнасці, у Салігорску пройдзе сямейны вайб «Да Месяца і назад». Праграма вельмі цікавая. Тут можна паслухаць месяцовыя вершы і пазнаёміцца са свістковай флейтай, пабачыць святочныя ліхтарыкі, выпіць чаю з Паднябеснай і пакаштаваць «сакрэтную» кітайскую страву. Таксама адкрыецца выстава «Прыгажосць Кітая ў паштовых марках». Ну і, вядома ж, сёння варта палюбавацца на поўню. Галоўную ў годзе.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Ельский комбинат бытового обслуживания» (продавец) извещает о проведении <u>12 октября 2022 года открытого аукциона</u> по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** расходы по переоформлению всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на покупателя | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-28297**, общей площадью **1069,3 кв. м,** назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – **дом быта № 2** (составные части и принадлежности: А2/к-дом быта № 2). Адрес: Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, тр-т Мозырский, д. 22. **Информация о земельном участке:** лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером **321450100004000061** общей площадью **0,2741 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Ельский р-н, ул. Мозырский тракт, д. 22. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания здания специализированного для бытового обслуживания населения. **Ограничение (обременение):** договор аренды № 20 от 01.04.2020 г. сроком действия по 31.03.2023 г.; площадь, сданная в аренду, – 11,8 кв. м; договор аренды № 31/21 от 01.01.2021 г. сроком действия по 31.12.2023 г.; площадь, сданная в аренду, – 8,0 кв. м; договор аренды № 7/2020 от 03.02.2021 г. сроком действия по 02.03.2023 г.; площадь, сданная в аренду, – 40,0 кв. м; договор аренды № 12/2021 от 01.06.2021 г. сроком действия по 31.05.2023 г.; площадь, сданная в аренду, – 39,0 кв. м; договор аренды № 37 от 01.06.2020 г. сроком действия по 31.05.2023 г.; площадь, сданная в аренду, – 29,5 кв. м; договор аренды № 15/21 от 14.10.2021 г. сроком действия по 13.10.2024 г.; площадь, сданная в аренду, – 9,4 кв. м; договор аренды № 26/2020 от 01.07.2020 г. сроком действия по 30.06.2023 г.; площадь, сданная в аренду, – 61,7 кв. м; договор аренды № 2 от 02.05.2020 г. сроком действия по 01.05.2023 г.; площадь, сданная в аренду, – 12,6 кв. м; договор аренды № 17/2020 от 01.07.2020 г. сроком действия по 30.06.2023 г.; площадь, сданная в аренду, – 13,0 кв. м; договор аренды № 14/21 от 04.10.2021 г. сроком действия по 03.10.2024 г.; площадь, сданная в аренду, – 10,09 кв. м; договор аренды № 101 от 25.10.2021 г. сроком действия по 31.05.2023 г.; площадь, сданная в аренду, – 6,0 кв. м; договор аренды № 25 от 01.01.2020 г. сроком действия по 31.12.2024 г.; площадь, сданная в аренду, – 12,7 кв. м, 148,0 кв. м – часть кровли здания; договор аренды № 99-2022 от 01.04.2022 г. сроком действия по 31.03.2025 г.; площадь, сданная в аренду, – 14,58 кв. м, 46,0 кв. м – часть кровли здания | **105 960,00** | 5 298,00 |

<u>**Продавец:**</u> ОАО «Ельский комбинат бытового обслуживания», Гомельская область, г. Ельск, ул. Дзержинского, 20.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 737-54-24 – Яцухно Василий Николаевич, 8 (02354) 3-51-07, 8 (029) 500-35-49 – Лопатко Ирина Михайловна.

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет <u>**Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):**</u> BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 10 сентября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 10 октября 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения.

<u>**Для участия в аукционе представляются:**</u> документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на <u>**5 (пять) %**</u>. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается <u>**Организатором**</u> в течение <u>**5 (пяти) рабочих дней**</u> со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение <u>**3 (трех) рабочих дней**</u> с момента подписания протокола, а также затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение <u>**3 (трех) рабочих дней**</u> с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение <u>**10 (десяти) рабочих дней**</u> от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение <u>**10 (десяти) рабочих дней**</u> с момента подписания договора купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – <u>www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»</u>.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.**

---

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Банк БелВЭБ», пр-т Победителей, 29, 220004, г. Минск** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронного аукциона – капитальное строение, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Саета Г.Е., 4** | |
| Наименование | Начальная цена с НДС 20 % |
| **ЗДАНИЕ БАНКА** **(здание специализированное финансового назначения), инв. номер 330/С-33528, общей площадью 738,7 кв. м.** Составные части и принадлежности: пристройка, подвал, два тамбура, гараж. **В состав лота входит иное имущество**, перечень размещен на сайте организатора аукциона и электронной площадке ИПМ-Торги | **696 242,84 бел. руб. (снижение 10 %)** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 323550100014000003:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,0779 га для обслуживания здания отделения банка | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки».** УНП 191 021 390 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после электронных торгов. **Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона** |
